6—7 ЛІСТАПАДА 1933 г. № 257—258.

ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ

Адрас рэдакцыі і канторы: г. Віцебск, плац Волі, Палац працы, 3-ці паверх
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА 2 р. у мес
Цана асобн. нумару 8 кап.

Тэлефоны рэдакцыі: Сакратарыят—1-73; нам рэдактара, партыйны і масавы сектары 6-76; сектары прамысловы, сельскагаспадарчы—72; рабоч. снабжэння і кааперацыі, сов. будаўніцтва і культурнага будаўніцтва 6-15, лістоў рабочых і калгаснікаў, бюро расследвання — 2-00 кантора—55; пачатак рэдакцыі—4-56.

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б, ГАРСОВЕТА І ГАРПРАФСОВЕТА.

СЕННЯ XVI КАСТРЫЧНІК.

НЯХАЙ ЖЫВЕ XVI ГАДАВІНА КАСТРЫЧНІКА! НЯХАЙ ЖЫВЕ ПРОЛЕТАРСКАЯ РЭВОЛЮЦЫЯ ВА УСІМ СВЕЦЕ!

ПАД СЦЯГАМ УсеКП(б) І ЯЕ ЛЕНІНСКАГА ЦК—УПЕРАД ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ! ВЫШЭЙ СЦЯГ УсеКП(б)—АРГАНІЗАТАРА КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ!



„...Мы маем права ганарыцца і мы ганарымся тым, што на нашу долю выпала шчасце пачаць пабудову Совецкай дзяржавы, пачаць гэтым новую эпоху сусветнай гісторыі, эпоху панавання новага класа, прыгнечанага ва ўсіх капіталістычных краінах, ідучага ўсюды да новага жыцця, да перамогі над буржуазіяй, да дыктатуры пролетарыята, да вызвалення чалавецтва ад ярма капітала, ад імперыялістычных войн“.

(ЛЕНІН).

16 год барацьбы і перамог.

Сёння—16 год з таго вялікага гістарычнага дня, калі пролетарыят Расіі ў цесным саюзе з бяднейшым сялянствам пад сцягам партыі большэвікоў, на чале з яе рулявым геніяльнейшым правадыром і настаўнікам т. Леніным зруйнаваў буржуазную ўладу і ўстанавіў дыктатуру пролетарыята.

16 год совецкай улады—16 год непрымірымай барацьбы двух сістэм: сістэмы капіталістычнай, якая прадстаўляе сабой сплашны хаос, якая з кожным днём, гадзінай, мінутай усё больш і больш прыходзіць у заняпад, дзе асноўныя масы насельніцтва рабочыя і працоўныя, акрамя голада, холада, жабрацтва, нэндзы нічога не бачаць, з сістэмай соцыялістычнай, народжанай 7 лістапада 1917 года.

12 год таму назад Ленін у артыкуле «Да чацвертай гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі» пісаў:

„МЫ МАЕМ ПРАВА ГАНАРЫЦЦА, І МЫ ГАНАРЫМСЯ ТЫМ, ШТО НА НАШУ ДОЛЮ ВЫПАЛА ШЧАСЦЕ ПАЧАЦЬ ПАБУДОВУ СОВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ, ПАЧАЦЬ ГЭТЫМ НОВУЮ ЭПОХУ СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ, ЭПОХУ ПАНАВАННЯ НОВАГА КЛАСА, ПРЫГНЕЧАНАГА ВА ЎСІХ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІНАХ“...

Мінула з таго часу 12 год... Няўхільна ажыццяўляючы, глыбока шануючы наказы правадыра, наша краіна прайшла гэты гістарычны адрэзак часу.

Перамогу за перамогай, цытадэль за цытадэляю заваёўваў пролетарыят пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і свайго любімейшага правадыра тав. СТАЛІНА, лепшага прадоўжніка справы Ільіча.

Грамадзянская вайна, за ёй аднаўленне, потым рэканструкцыя—усё гэта назвы, змест якіх выражае часы, эпоха, перыод.

Поспехі, якіх дасягнула за гэты час соцыялістычная сістэма—каласальны. Тое, што будавалася, вырастала ў нас на працягу месяцаў, году,—для гісторыі капіталістычных ладаў з'яўляецца недасяжным цудам.

І сапраўды. Што прадстаўляе ў мінулым Расія? Адсталую, аграрную, напоўкаланіяльную краіну—такой дасталася яна пролетарыяту ў выніку Кастрычніцкай рэволюцыі. 16 год дыктатуры пролетарыята да непазнавае масці змянілі твар нашай совецкай зямлі.

Краіна буйнай індустрыі з перадавой тэхнікай, з буйнейшай ў свеце калектывізаванай і машынізаванай сельскай гаспадаркай—вось што ў кароткіх рысах сёння сабой прадстаўляе Совецкі саюз.

Падагульваючы вынікі першай пяцігодкі, тав. Сталін сказаў:

„У нас не было чорнай металургіі, асновы індустрыялізацыі краіны. У нас яна ёсць цяпер.

У нас не было трактарнай прамысловасці. У нас яна ёсць цяпер.

У нас не было аўтамабільнай прамысловасці. У нас яна ёсць цяпер.

У нас не было варштатабудаўніцтва. У нас яно ёсць цяпер.

У нас не было сур'ёзнай і сучаснай хімічнай прамысловасці. У нас яна ёсць цяпер.

У нас не было сапраўднай і сур'ёзнай прамысловасці па вырабу сучасных сельска-гаспадарчых машын. У нас яна ёсць цяпер.

У нас не было авіяцыйнай прамысловасці. У нас яна ёсць цяпер.

У сэнсе выпрацоўкі электрычнай энергіі мы стаялі на самым апошнім месцы. Цяпер мы вышлі на адно з першых месц.

У сэнсе здабывання нафтавых прадуктаў і вугля мы стаялі на апошнім месцы. Цяпер мы вышлі на адно з перадавых ..

А ўсё гэта прывяло да таго, што капіталістычныя элементы выцеснены з прамысловасці канчаткова і безпаваротна, а соцыялістычная прамысловасць стала адзінай формай індустрыі ў СССР...

Нарэшце ўсё гэта прывяло да таго, што з краіны слабай і не падрыхтаванай да абароны Совецкі саюз ператварыўся ў краіну магутную, у сэнсе абароназдольнасці, у краіну гатовую да ўсякіх выпадковасцяй, у краіну здольную вырабляць у масавым маштабе ўсе сучасныя прылады абароны і забяспечыць імі сваю армію ў выпадку напада звонку“.

Мы паспяхова ажыццяўляем ленінскую нацыянальную палітыку.

Паглядзіце на БССР. Былая царская калонія, якая вякамі прыгняталася памешчыкамі, царскімі сатрапамі, адсталая сельска-гаспадарчая краіна з надзвычай слаба развітай прамысловасцю поўсаматужнага і саматужнага тыпа,—БССР пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і пры актыўнай дапамозе рабочага класа СССР ператварылася ў індустрыяльна-аграрную краіну, ва ўзорную совецкую рэспубліку.

У параўнанні з даваенным часам прадукцыя прамысловасці БССР вырасла ў дзесяць разоў. Першая пяцігодка ўзброіла Беларусь перадавой тэхнікай як прамысловасць, таксама і сельскую гаспадарку.

Гэтых поспехаў і перамог пролетарыят і працоўныя Совецкай Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б. пры братэрскай дапамозе пролетарыята саюзных рэспублік дабіліся ва ўмовах жорсткай барацьбы і разгрома контррэволюцыйнай нацдэмаўшчыны, у бязлітаснай барацьбе з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізма—галоўнай небяспекі, рашучай барацьбе з усялякімі адхіленнямі ад генеральнай лініі ленінскай партыі і прымірэнцтвам да ўхілаў.

Акінце зрокам наш Віцебск. Ён зараз—адзін з буйнейшых пролетарскіх цэнтраў Беларусі, на тэрыторыі якога—гіганты соцыялістычнай індустрыі:

„КІМ“, „Сцяг індустрыялізацыі“, шчоткамбінат, маслазавод,—дзецішчы першай пяцігодкі.

„Дзвіна“, «Прафінтэрн», «Чырвоны металіст», акулярная, імя Лекерта, панчошная імя Клары Цэткін і рад іншых фабрык і заводаў, якія падвергліся карэннай тэхнічнай рэканструкцыі.

Каласальных поспехаў Віцебшчына дасягнула пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і ў вырашэнні самай складанай і самай адказнай задачы—гэта перарабкі сельскай гаспадаркі на соцыялістычны лад.

64—вось процант калектывізацыі нашага раёна на сёння. Буйнейшыя совгасы і калгасы—гэтыя цытадэлі соцыялізма на вёсцы выраслі з былых дробных, драбнюткіх і індывідуальных сялянскіх гаспадарак і з кожным днём узмацняюцца, шырацца, квітнеюць.

Па-ударнаму выконваецца наказ тав. Сталіна—нашы калгасы становяцца большэвіцкімі, у кожным калгасе, калгасным двары будуецца заможнае радаснае соцыялістычнае жыццё.

Будаўнікамі гэтага жыцця з'яўляюцца такія калгаснікі-ударнікі, як РАЎКОЎ Якуб Сцяпанавіч (калгас імя ЧЫРВОНАЙ АРМІІ), ВАЯВОДАВА Марфа (калгас „КОМУНАР“), АЛЬТМАН Даніл (калгас „НАЕР ЛЕБН“), малады калгаснік АРДЫНАЎ Іван — гэтыя адзінкі многамільённай арміі лепшых ударнікаў, адданейшых змагароў за культурнае, заможнае, светлае, калгаснае жыццё.

На Віцебшчыне арганізавана машынна-трактарная станцыя. 23 трактары—гэтыя сталёвыя коні назва якіх „Ітэр“, „Комунар“, „Фардзон“, „Большэвік“ гуляюць па калгасных палях знішчаючы назаўсёды межы былых дробных разрозненых індывідуальных сялянскіх гаспадарак, ліквідуючы капіталістычныя перажыткі ў эканоміцы і свядомасці людзей.

Складанымі і напоўскладавымі малатарнямі, сеялкамі, веялкамі, жняваркамі, касаркамі, сіласарэзкамі і іншай новай тэхнікай узброены нашы калгасы. У 23 калгасных і совгасных адзінках нашага раёна ярка свеціцца лямпачка Ільіча.

Непісьменнасць адна з цяжкіх спадчын царызма—ліквідавана. Віцебшчына на зараз суцэльна пісьменны раён, на тэрыторыі якога ажыццяўлена ўсе агульнае, пачатковае, палітэхнічнае навучанне.

Вышэйшыя навуковыя ўстановы, тэхнікумы, рабфакі, даследчыя ўстановы, тэатры і кіно, цырк, клубы, чытальні, бібліятэкі — вось далёка няпоўны пералік тых адзінак, праз якія ўкараняецца штодзённа культура ў горадзе, на раёне, у калгасах, совгасах, сярод працоўных аднаасобнікаў.

Глядзіш на ўсе гэтыя перамогі і як смешнымі для нас гучаць сёння прадраканні буржуазіі, соцыял-здраднікаў і іншай агентуры буржуазіі, якія на розныя матывы перапявалі аб тым, што «Совецкая ўлада не на доўгі час, бо яна не справіцца са складанай задачай—кіраўніцтва буйнай дзяржавай».

Вялікі дзень свята XVI-годдзя Кастрычніка мы сустрэлі з такімі поспехамі, якіх не могуць нават адмаўляць нашы ворагі.

Тав. Сталін, падкрэсліваючы сусветнае значэнне Кастрычніцкай рэволюцыі казаў:

«СУСВЕТНАЕ ЗНАЧЭННЕ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ САСТАІЦЬ НЕ ТОЛЬКІ Ў ТЫМ, ШТО ЯНА З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВЯЛІКІМ ПАЧЫНАМ АДНОЙ КРАІНЫ Ў СПРАВЕ ПРАРЫВА СІСТЭМЫ ІМПЕРЫЯЛІЗМА І ПЕРШЫМ АЧАГОМ СОЦЫЯЛІЗМА Ў АКІЯНЕ ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНЫХ КРАІН. АЛЕ І Ў ТЫМ, ШТО ЯНА СКЛАДАЕ ПЕРШЫ ЭТАП СУСВЕТНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ І МАГУТНУЮ БАЗУ ЯЕ ДАЛЕЙШАГА РАЗГОРТВАННЯ».

На фронце ўсё разрастаючагася сусветнага крызіса капіталістычнай гаспадаркі, велізарнага ўзмацнення жабрацтва і эксплоатацыі працоўных мас, гіганцкія поспехі Совецкага саюза за XVI й гадавіны Кастрычніка і захопліваючыя перспектывы другой пяцігодкі аказваюць аграмадны рэволюцыянізуючы ўплыў на працоўных і эксплоатуемых усіх краін.

Упэўнена і цвёрда несакрушальнай крэпасцю ўступае СССР у XVII год Кастрычніцкай рэволюцыі.

А ў капіталістычных краінах рабочых і працоўных сялян чакае пятая галодная зіма. Голад, холад, беспрацоўе, галеча, вострая нестача туліцца ў хатах, пакутуючых працоўных капіталістычных краінах, гэта асабліва востра адчуваецца ў Германіі, Польшчы і Заходняй Беларусі. Пятая галодная зіма ідзе поруч з шалёнай падрыхтоўкай імперыялістычнай вайны і хваляй жорсткага фашысцкага тэрора.

Усё гэта з асаблівай сілай рэволюцыянізуе шырокія масы рабочых і працоўных капіталістычных краін, згуртоўваючы іх пад сцягі Комінтэрна.

Нашы перамогі здабыты ў жорсткіх баях з класавымі ворагамі і яго агентурай.

У бязлітаснай барацьбе на два франты супроць правага ўхіла—галоўнай небяспекі і «левых» апартуністаў, а таксама з прымірэнцтвам да іх, партыя забяспечыла выкананне першай пяцігодкі за чатыры гады і стварыла ўсе ўмовы для паспяховага ажыццяўлення другой пяцігодкі—пяцігодкі пабудовы бескласавага соцыялістычнага грамадства.

Гэтыя перамогі не танна даліся рабочаму класу і працоўным. Агнём і жалезам, вайной і інтэрвенцыяй, голадам і блакадай, турмамі і шыбеніцамі прабавалі ўнутраныя і знешнія ворагі задушыць Кастрычніцкія заваёвы. Мы гэтыя заваёвы адстаялі. І гора будзе таму, хто ўперад пасмее пасягнуць на заваёвы пролетарыята і працоўных.

Мабілізуючы творчую актыўнасць усіх працоўных, няўхільна ажыццяўляючы генеральную лінію партыі пад сцягам партыі Леніна—Сталіна, бязлітасна зламваючы супраціўленне класавага ворага і яго агентуры ў шэрагах партыі, бязлітасна змагаючыся на два франты, наперад, да сусветнага Кастрычніка.



«Дзе тыя асноўныя сілы, якія забяспечылі нам гэту гістарычную перамогу, не гледзячы ні на што?

Гэта, перш за ўсё, актыўнасць і самаадданасць, энтузіязм і ініцыятыва мільённых мас рабочых і калгаснікаў, што развілі разам з інжынерна-тэхнічнымі сіламі велізарную энергію па разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Не можа быць сумнення, што без гэтай акалічнасці мы не маглі б дабіцца мэты, не маглі-б рушыцца ўперад ні на крок.

Гэта, па другое, цвёрдае кіраўніцтва партыі і ўрада, заклікаўшых масы ўперад і пераможыўшых ўсе і ўсялякія трудвасці на шляху да мэты.

Гэта, урэшце асобая годнасць і перавага совецкай сістэмы гаспадаркі, захоўваючай у сабе вялізныя магчымасці, неабходныя для перамогі ўсіх і ўсякіх трудвасцей.

Такавы тры асноўных сілы азначаўшыя гістарычную перамогу СССР».

(СТАЛІН).

БССР З ГОНАРАМ ВЫКАНАЛА СВАЕ АБАВЯЗКІ ПЕРАД ПРОЛЕТАРЫЯМІ ЛЕНІНГРАДА.

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО,
ЦВК БССР—т. ЧАРВЯКОВУ,
СНК БССР—т. ГАЛАДЗЕДУ.

Большэвіцкімі намаганнямі рабочых і калгаснікаў, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК, БССР датэрмінова выканала план загатовак бульбы і гародніны для горада Леніна. Працоўныя БССР прынялі на сябе абавязак дадаткова адгрузіць 20 тысяч тон бульбы. ЦК КП(б)Б і Совнаркам БССР праявілі выключную ўвагу да снабжэння рабочых і работніц Ленінграда.

Ленінградскі абласны і гарадскі камітэты УсеКП(б), ленінградскі абласны выканком і ленінградскі совет горача вітаюць працоўных Совецкай Беларусі, атрымаўшых буйную перамогу ў выкананні важнейшага дзяржаўнага задання. Мы ўпэўнены, што працоўныя Беларускай ССР і ва ўсіх іншых галінах соцыялістычнага будаўніцтва з большэвіцкай энергіяй змагаюцца за генеральную лінію партыі. Ленінградскі аблвыканком і ленінградскі совет вылучаюць спецыяльны фонд для прэміявання лепшых калгасаў і лепшых ударнікаў БССР. Мы запрашаем рабочых і калгаснікаў БССР прыняць удзел у кастрычніцкіх урачыстасцях у Ленінградзе.

Няхай жыве брацкае супрацоўніцтва народаў Совецкага саюза.

Няхай жыве БССР!

Няхай жыве слаўная большэвіцкая партыя і яе правадыр тав. СТАЛІН.

Сакратар Ленінградскага абкома і гаркома УсеКП(б) КІРАЎ.

Старшыня Ленінградскага аблвыканкома СТРУПЕ.

Старшыня Ленінградскага совета КАДАЦКІ.

Адчыненне Дома ўрада ў Менску.

Высока над сталіцай БССР узняўся Дом ўрада, які займае амаль цэлы квартал і мае 43 тысячы квадр. метраў плошчы, 12 ліфтаў, 600 пакояў, шмат залаў. Асабліва вылучаецца цэнтральная зала з'ездаў на тысячу месц. Гэты зал радыофікуецца і упрыгожваецца гербамі ўсіх совецкіх рэспублік, зробленымі ў Ленінградскай акадэміі мастацтваў. Перад Домам урада—вялікі помнік Леніну. Дом урада ў сярэдзіне ўпрыгожваецца партрэтамі правадыроў, бюстамі Маркса, Энгельса, Бабефа, Чарнышэўскага, Лібкнехта, Мяснікова, Дзяржынскага і Фрунзе. У залах пасяджэнняў вялікая панарама ўзяцця Зімняга палаца, прыезд Леніна ў Расію і Сталін на фоне соцбудаўніцтва. Над мастацкім упрыгожваннем Дома ўрада працуюць выдатнейшыя мастакі і скульптары Саюза і БССР.

7 лістапада адбудзецца ўрачыстае адчыненне Дома ўрада. СНК БССР на гэту ўрачыстасць запрасіў дэлегацыі з Масквы, Ленінграда і ўсіх брацкіх рэспублік.

Новы буйны гігант.

10 лістапада наша рэспубліка святкуе вялікую перамогу—урачысты пуск Касцюкоўскага шклозавода гіганта на Гомельшчыне, аднаго з буйнейшых у Саюзе заводаў па выпрацоўцы высокаякаснага ваконнага шкла. На ўрачысты пуск гэтага гіганта запрошан Наркамлегпрам Саюза т. ЛЮБІМАЎ і яго намеснік т. ЛЕВІН.

18.600 тыс. руб. затрачана на будаўніцтва Касцюкоўскага завода, з якіх больш 4 млн. вызначана на камунальна бытавое абслугоўванне рабочых і ІТР. Шэсць вагонаў высокаякаснага шкла ў суткі—вось вытворчы размах завода, абсталяванага па-водле апошняга слова тэхнікі. Гэты завод дасць прадукцыі больш за ўсе цяпер існуючыя ў БССР шклозаводы, разам узятыя. Недалёка ад завода вырас соцыялістычны гарадок для рабочых і ІТР. Пабудаваны магазіны, амбулаторыя, пажарнае дэпо і сталоўка з прапускной здольнасцю на 2 тысячы абедаў. Канчаецца пабудова ФЗС.

Да канца года рабочыя абавязаліся пусціць завод на поўную магутнасць. Пабудова касцюкоўскага гіганта з'яўляецца новай буйнай перамогай ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА ПЕРАДАВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ.

АКУЛЯРНАЯ ФАБРЫКА.

Трыкутнік—ГАЛУЗА, ГАЛАНЦАЎ, БАРАНОЎСКАЯ. Лепшыя ўдарнікі—ЗЫКІН, МАМОЙКА, БАРАНОК, ШАПІРА, ПЛОТКІНА.

За дзевяць месяцаў 1933 года прамфінплан па фабрыцы выканан на 103,3 проц., за кастрычнік—102,8 проц.

Фабрыка дабілася зніжэння сабекошта замест 1,1 проц.—на 7,12 проц., што дала эканоміі ў 240 тысяч рублёў. Прадукцыйнасць працы дасягнула 113,34 проц. Брак зніжан на 5,1 проц. супроць плана.

ФАНЕРНЫ ЗАВОД.

Трыкутнік—МАЛЬЧЫК, МІЛЬКІН, АЛЕШКА. Лепшыя ўдарнікі—КОЦІК, ЛАДНОЎ, РАЯК, СКУМАН.

За 9 месяцаў 1933 года план выканан на 102,9 проц., за кастрычнік—на 112,2 проц.

Па заводу заданне па ўзняцці прадукцыйнасці працы выканала на 100,82 проц. Лепшая брыгада завода—брыгада Коціка поўнасцю загрузіла свой рабочы дзень, работае поўных 420 мінут у дзень. Замест працуючых раней 8 рабочых, зараз у брыгадзе 7 чалавек поўнасцю спраўляюцца з усёй работай.

АЛЕЙНЫ ЗАВОД.

Трыкутнік—ГУРЭВІЧ, ШАПІРА, РЫЖЫК. Лепшыя ўдарнікі—БУШУЕЎ, ЛІСОЎСКІ, СІМАКОЎ, ПАСКОКАЎ.

За 9 месяцаў 1933 года план выканан на 111,4 проц., за кастрычнік—на 109,1 проц.

Завод па якасці выпускаемай прадукцыі займае адно з першых месц у Саюзе. Замест нармальнай астачы ў жмыху алея ў 7 проц., завод дабіўся астачы алею ў 6,66 проц.

Завод замест паўтара месяца скончан рамонтам за месяц.

Замест выдаткаваных раней прэс-сукна 1050 грам на 1 тону сыравіны зараз выдаткоўваецца 500 грам.

ФАБРЫКА „ДЗВІНА“.

Трыкутнік—КАПЛАН, КВІНТА, СУШЧАНКА. Лепшыя ўдарнікі—БАРАНОЎСКАЯ, РАМАНАВА, КАЗАКОВА, ЦЫГАНКОВА.

За 9 месяцаў 1933 года па фабрыцы план выканан на 101,7 проц., за кастрычнік—100,1 проц. Замест запраектаванага па плане зніжэння сабекошта на 7,4 проц., фабрыка знізіла яго на 9,8 проц. Прадукцыйнасць працы складае на 103 проц.

СКУРЗАВОД.

Трыкутнік—ЭЗРЫН, ШВАЙНШТЭЙН, ЗАРАГАЦКІ. Лепшыя ўдарнікі—МІХЕЛЬСОН, ВАРАШЫЛАЎ, ВАСІЛЕЎ.

За 9 месяцаў 1933 года па заводзе план выканан на 100 проц., за кастрычнік—100,9 проц. Прадукцыйнасць працы выканана на 108 проц.

На варце заваёў Кастрычніка.

У самы разгар узброенай барацьбы з класавым ворагам, пад перакрыжным агнём белых банд нарадзілася 27 Омская. З гэтага часу байцы Омскай разам з рабочым класам і ўсімі працоўнымі краіны Советаў пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі высока неслі чырвоны сцяг перамог над класавымі ворагамі.

З гонарам байцы Омскай перанеслі ўсе цяжкасці гістарычных дзён грамадзянскай вайны, увеслі незапомныя гераічныя старонкі ў гісторыю барацьбы рабочага класа за дыктатуру пролетарыята, за права будаваць бяскласавае соцыялістычнае грамадства ў нашай краіне, за ўмацаванне абароназдольнасці краіны, за лепшыя паказальнікі ў баявой і палітычнай вучобе.

Шырока ўжываючы ў сваёй рабоце метады соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, Омская, пад кіраўніцтвам партарганізацыі выдатна змагалася і змагаецца за вырашэнне ўсіх стаячых перад ею задач.

Закончыўшы навучальны год, омцы падыходзяць да XVI Кастрычніка з наступнымі паказальнікамі:

па АГНЯВОЙ падрыхтоўцы—ВЫДАТНА;
па СТРАЛКОВА-артылерыйскай — ВЫДАТНА;
па СПЕЦЫЯЛЬНАЙ (інжынернай, хімічнай і інш.)—ВЫДАТНА;
па СТРАЯВОЙ і фізычнай — ВЫДАТНА;
па ТАКТЫЧНАЙ—ВЫДАТНА;
па ПАЛІТЫЧНАЙ—ДОБРА.

Рэволюцыйная дысцыпліна і арганізаванасць байца павысілася. Партыйная асвета дае марксісцка-ленінскае загартаванне байцу і камандзіру, пашыраючы іх кругагляд і падвышаючы іх класавую пільнасць.

Актыўным удзелам у чыстцы партыйных радоў, уступленнем у калгасы, замацаваннем на звыштэрміновую службу сотні омцаў за ленінскую генеральную лінію.

Тысячы працадзён адработалі байцы і камандзіры на калгасных, совгасных, палях і новабудоўлях. З лепшымі паказальнікамі яны прышлі да своечасовай уборкі, выкананне абавязацельстваў перад дзяржавай, сева азімага кліна ў сваіх дапаможных гаспадарках.

Дзесяткі і сотні палітычна і тэхнічна падрыхтаваных байцоў, ударнікаў, дэмабілізаваных у гэтым годзе, уступілі ў калгасы.

Велізарную дапамогу ў раёнах камплектавання дывізіі аказалі омцы ў справе забеспячэння ўсіх сельска-гаспадарчых кампаній і вядучай ролі пераменніка-омца.

Лепшымі перадавікамі - ударнікамі з'яўляюцца:

БАЙЦЫ: Масабітаў, Сосіпатраў, Шман, Фёдараў, Піскун;
МАЛОДШЫЯ КАМАНДЗІРЫ: Вафін, Жываў, Сашко, Какорын, Бролікаў;
СЯРЭДНІ НАЧСКЛАД: Налівайка, Святнаў, Балабошка, Клімаў, Рыбакоў;
КАМБАТ Рыбакоў і яго НАЧШТАБА Раннеў.

Байцы, начсклад і партарганізацыя, не супакоіўшыся на дасягнутых рэзультатах у баявой і палітычнай падрыхтоўцы, разгарнулі зараз шырокую падрыхтоўчую работу да новага вучэбнага года.

Пад кіраўніцтвам партыі, яе ленінскага ЦК, на чале з правадыром сусветнага пролетарыята тав. СТАЛІНЫМ, адзінай згуртаванай сям'ёй чырвонасцяжная Омская будзе паўсядзённа, паўсягадзінна ўмацоўваць абарону першай у свеце краіны пролетарскай дыктатуры.

АЛЯКСЕЯЎ.

6 ЛІСТАПАДА, а 6 гадз. увечары, у памяшканні Беларускага Дзяржаўнага тэатра

АДБУДЗЕЦЦА

урачысты пленум гарсовета

з удзелам партыйных, прафесіянальных, комсамольскіх арганізацый і вайсковых часцей,

прысвечаны дню святкавання XVI-й гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі.

Члены і кандыдаты ЦК і ЦКК КП(б)Б, ЦВК СССР і БССР, бюро ГК КП(б)Б і ЛКСМБ, прэзідыумаў гарКК КП(б)Б і гарпрафсовета на пленум праходзяць па сваіх мандатах, рабочыя-ударнікі прадпрыемстваў і ўстаноў—па запрашальных білетах, выданых ФЗМК праз гарпрафсовет.

Дэпутаты гарсовета, запрошаныя на святкаванне калгаснікі-ударнікі і працоўныя аднаасобнікі раёна, а таксама і рабочыя-ударнікі, запрошаныя з іншых гарадоў, праходзяць рэгістрацыю ў сакратарыяце гарсовета (пакой № 25 у тав. МІЛЕШКО) 6 лістапада з 2-х гадзін дня да 6 гадзін увечары.

Пасля ўрачыстага пленума адбудзецца інтэрнацыянальны вечар сіламі БДТ 1, Дзяржсета, ТРАМ'а і Дзяржцырка.

Гарачае прывітанне калгаснікам-ударнікам, выканаўшым свае абавязацельствы перад пролетарскай дзяржавай. За большэвіцкія калгасы! За заможнае, культурнае калгаснае жыццё! За ўладанне тэхнікай соц. земляробства!

НА БЫЛЫХ АБШАРАХ МІРАЕДА ХАЧКОЎСКАГА БУДУЮЦЬ КАЛГАСНІКІ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ.

Значным паляпшэннем свайго матэрыяльна-бытавога становішча сустракаюць калгаснікі калгаса «БОЛЬШЭВІК», Бабініцкага сельсовета, XVI гадавіну Кастрычніка.

137 гаспадарак былых беднякоў і серадзнякоў. На прасторах 1260 га зямельнай плошчы калгаса паступова і няўхільна ўкараняючы механізаваныя працэсы ў сельскую гаспадарку будуюць новае соцыялістычнае жыццё.

Больш паловы ўраджая знята тут у гэтым годзе касілкамі, жнеяркамі, бульбакапалкамі. На поўскладанай трактарнай малатарні абмалочана ўсё азімае жыта, больш 50 проц. яравых культур. Сто з лішнім га зябі ўзнята трактарамі. Машыны заваёўваюць сваю перавагу і аўтарытэт у калгаснікаў. Лягчэй, спарней работа, больш прастора для калектыўнай прадукцыйнай работы.

А 16 год назад тут былі землі абшарніка Хачкоўскага, які меў 331 га зямлі, кулакоў Грыгор'евых, Бугаёва і Францэвічаў. Яны трымалі ў сваіх руках больш зямельных угоддзяў цяперашняй гаспадаркі калгаса. Добра жылося тут эксплоататарам, амаль дарэмна карысталіся яны працай беднякоў сялян, якім не было куды выпусціць сваю жывёлу,—бо ўсюды была зямля гэтых багацеяў. Лютавалі міраеды. Недарма заўсёгдатаямі-дачнікамі ў Хачкоўскага былі віцебскі спраўнік і паліцмэйстэр. Спакойна адчувалі за гэтай абаронай сябе каты. Усе пратэсты супроць несправядлівага землякарыстання, усе рэволюцыйныя хвалянні, спробы знішчыць гнёт, жорска ўсміраліся паліцыяй. Працоўнага селяніна прыціскала галеча, прыгнятала малазямелле. І таму ў час рэволюцыі з лютай ненавісцю сяляне вёсак Бялынавічы, Навасёлкі і інш. зруйнавалі дашчэнту маёнткі Бялынавіцкага пана Хачкоўскага.

Аднак, кулакі Грыгор'евы, Бугаёвы ўмудрыліся «прыстасавацца» і, пасля рэволюцыі працягвалі эксплоатаваць у сваіх кулацкіх гаспадарках частку сялянскай бедняты. Толькі калектывізацыя сельскай гаспадаркі выкінула гэта кулачча з іх насіджаных месц.

* * *

Арганізаваўся калгас «Большэвік» у 1929 г. з 36 гаспадарак. Перавагі калгаснага жыцця характарызуюцца яго ростам. Зараз калгас прадстаўляе з сябе моцную, вялікую гаспадарку. Штогодняе паляпшэнне бытавых умоў калгаснікаў і гаспадарчае ўмацаванне калгаса з'явілася красамоўным фактарам для ўступлення аднаасобнікаў у калгас. Толькі вясной гэтага года ў калгас уступіла 19 гаспадарак аднаасобнікаў з вёскі Бялынавічы і 21 гаспадарка з вёскі Шумоўшчына.

У калгасе 7 брыгад, з іх 5 паляводчых, 1 садовагародная і 1 жывёлаводчая. Калгас мае 78 рабочых коней, малочную ферму, у якой 55 дойных кароў, больш 30 нецелей і 26 целят.

Разлічыўшыся поўнасцю з дзяржавай па збожжа і бульбапастаўках і па натураплаце за работу МТС калгас са свайго добрага ўраджая выдае на працадзень калгасніку ў гэтым годзе —жыта 2 кг., аўса 1,5 кг., ячменя 800 грам, бабовых 150 грам, бульбы 6 кг., сена 2,5., саломы 600 грам і грашыма 51 кап. Гэтыя поспехі ў каштоўнасці працадня дасягнуты дзякуючы карэннай перабудовы работы, арганізацыі працы, паднящя працоўнай дысцыпліны пасля гістарычнай прамовы т. Сталіна на першым Усесаюзным з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў, аб тым як зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Дзякуючы гэтай перабудовы работы ў веснавую сяўбу калгас вышаў першым па сельсовету. Па ўсіх брыгадах прытрымліваліся севазваротаў і, толькі ў адной яны парушаны—ў Навасёлкаўскай брыгадзе. Адданасць справе калгаса, змаганне за заможнае жыццё, лепшая апрацоўка глебы дала і добрыя паказчыкі ўраджая—жыта ўрадзілася—9 цэнт. з га, яравыя 10 цэнт. з га, бульба 500—700 пудоў з га. Асабліва добра ўрадзілася бульба ў Бялынавічах і Новасёлках, дзе га даў больш 800 пудоў буйнай, чыстай бульбы.

Брыгады паміж сабой спаборнічалі на лепшае правядзенне ўборкі, на лепшае захаванне ўраджая, на хутчэйшы абмалот збожжа. Першай па калгасу вышла цэнтральная брыгада (брыгадзір Жаўранкаў), якая раней ўсіх завяршыла ўборку яравых і бульбы, поўнасцю завяршыла абмалот. Дзякуючы ўзорнай арганізацыі работы брыгада дасягнула гэтых перамог не гледзячы на тое, што ў ёй рабочай сілы менш за другіх. Адсталі брыгады Новасёлкаўская (брыгадзір Бугаеў) і Салавінская (брыгадзір Барысенка). Тут былі зацягнуты ўборка і азімая сяўба, дрэнна забуртоўвалася бульба, былі выпадкі крадзежа і страт ураджая з-за недогляда брыгадзіраў.

Калгас выхаваў многа ўдарнікаў соцыялістычных палёў, паказваючых прыклады дысцыплінаванасці, арганізаванасці, выканання і перавыканання норм. З іх Трахіменка Васіль, які з сям'ёй выпрацаваў 1022 працадня за 9 месяцаў, сям'я Уласенка—610 працадзён, Зязюлька Міхаіл—303 працадня і інш.

Са злоснымі прагульшчыкамі і лодырамі добрасумленныя калгаснікі не ліберальнічаюць. Так, пасля некалькіх папярэджанняў былі выключаны з калгаса лодыры: БОЛЬШАКОЎ РЫГОР БОЛЬШАКОЎ МАКСІМ.

Няўхільна ідзе гаспадарчае ўмацаванне калгаса—на месцы былых зруйнаваных маёнткаў ХАЧКОЎСКАГА выраслі новыя будынкі калгаса: 2 скотных двара, 5 хлебных сараяў, абора і іншыя. Калгас набыў рад сельскагаспадарчых складаных машын, жнеярак-самаскідак, касілак, бульбакапалак. Заканчваецца пабудова новага будынка школы. З кожным годам усё больш задавальняецца рост культурных запатрабаванняў калгаснікаў. Праектуецца дзіцячы сад, у якім улетку знаходзілася 80 дзяцей, аставіць на зіму, арганізаваць сталае кіно, бібліятэку. У корані мяняецца быт калгаснікаў. Замест былых п'яных вечарак, калгаснікі з ахвотай ідуць на кіно-пастаноўкі, ідуць на вечары. Моладзёж арганізуецца вакол комсамольскай ячэйкі, у якой налічваецца 9 чал.

Прайшло XVI год з моманта пролетарскай рэволюцыі і ў корані змянілася жыццё былога бедняка, батрака і серадняка, якія жылі ў вечнай турботе аб заўтрашнім дні, у бязвыходных патугах выйсці да лепшага жыцця. Былыя беднякі, батракі сталі пад кіраўніцтвам партыі, арганізуючай сілай ў калгасе і сваёй добрасумленнай работай дасягнулі заможнага жыцця.

БЫЛЫ БЕДНЯК ТРАФІМЕНКА ВАСІЛЬ-ударнік, за сваю добрасумленную работу з сям'ёй АТРЫМАЕ 270 ПУД. ХЛЕБА, 366 ПУД. БУЛЬБЫ, 150 ПУД. СЕНА, 511 РУБ. ГРАШЫМА. СЕМ'Я АЎЛАСЕНКА былога серадняка, атрымае 165 ПУД. ХЛЕБА, 220 ПУД. БУЛЬБЫ, СЕНА 90 ПуД. і грашыма 305 руб. Такіх сямей ўдарнікаў у калгасе многа, якія з задаваленнем кажуць, што ёсць нам з чым сустракаць гадавіну Кастрычніка. Зараз у нас ужо ёсць ў каго ча адней, а ў каго і па дзве свіні, аўцы і розная птушка, пракарміць якую нам хопіць чым. Ураджай у калгасе добры, ды з сваіх гародаў убралі. Дзецям нашым шырокі шлях адкрыт для атрымання адукацыі—школа ў нас пад бакам. Тую задачу, якую паставіў перад намі наш любімы першы калгаснік т. СТАЛІН аб заможным калгасным жыцці, мы з гонарам выканаем і будзем яшчэ лепш працаваць, яшчэ лепш ахоўваць наша калгаснае дабро каб зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Завяршаецца малацьба яравых. Распрацаван план засыпкі насенных і страхавых фондаў, пасля чаго калгас прыступіць да канчатковага размеркавання ўраджая паміж калгаснікаў. Каб адзначыць гадавіну Кастрычніка поўным выкананнем усіх сельска-гаспадарчых работ, уся рабочая сіла пераключана на завяршэнне зяблівага ворыва, пераворванне бульбы і, у асаблівасці на здачу гародніны дзяржаве. І сапраўды, кожны дзень беспярэрыўна едуць падводы з калгаса „Большэвік" з добрай капустай, маркоўкай, бручкай пролетарам горада.

А. С.

УПЭЎНЕНА ІДЗЕМ ПА ШЛЯХУ ДА ЗАМОЖНАГА ЖЫЦЦЯ.

У сувязі з вялікім пролетарскім святам Кастрычніцкай рэволюцыі мы, калгаснікі калгаса «МАРКАВІЧЫ», Нікалаеўскага сельсовета, рашылі сёння расказаць усёй працоўнай грамадскасці Віцебшчыны пра сваё калгаснае жыццё.

Наш калгас інтэрнацыянальны. У яго ўваходзяць 10 сямей кітайцаў, 4 сям'і палякаў, адна сям'я літоўская, адна латышская і 6 сямей беларусоў. Працуем мы ўсе дружна. Арганізатарамі калгаса ў 1928 годзе з'явіліся 3 кітайскіх сям'і. Далі ім 17 га зямлі, з іх 3 га ворыва, а астатняя была занята пад сенажацю садам. Вельмі цяжка было ў першы год. Не было ў іх ні каня, ні каровы, ніякага інвентара, насення, нават не было дзе начаваць. Жылі на працягу года разам у старым будынку былой малочнай.

Ненавідзіла іх кулацкая частка, ты кала ім.

— „Вам на рынку спекуляваць, а не зямлю араць. Землярobы! Прыехалі заразу тут завадзіць. Не губляйце вы свае сілы, усёроўна нічога не ўгодзіць, толькі самі сабе ўбытак нагоніце".

Не паслухаліся мы кулацкай агітацыі Буевічавых, Лебедзевых, Кольскіх, Свершэўскіх. Сабралі грошай, купілі 2 кані, двое цялег, два плугі са збруяй, насення і засеялі 1 га бульбы, 2 га аўса і 5 га гародніны. Праўда, позна ўжо сеялі, глеба наша не была ўгноена і ўраджай атрымалі нізкі. Гэта яшчэ больш давала кулаку повад агітаваць супроць нас і нашага калгаса.

У канцы 1928 года дзяржава адпусціла нам крэдыта 5000 рублёў. За грошы мы купілі 5 кароў і дом. Зімовы час скарысталі для вывазкі гноя з горада. 13 вагонаў прывезлі гноя і плюс да гэтага ад дзяржавы атрымалі мінеральнага ўгнаення. Весной, ледзь толькі снег зышоў, мы адразу-ж прыступілі да сяўбы, засеялі рана, палолі сваечасова, і ўвосень наш калгас даў чыстага прыбытка 5000 рублёў. Пасля гэтага пачалі уступаць да нас аднаасобнікі навакольных вёсак. Калгас наш ужо налічваў 20 гаспадарак, але у канцы 1931 года раздзялілі нас на два калгасы. Маёмасць, якая была набыта, была падзелена на дзве паловы. У 1932 годзе пачалі да нас уступаць зноў аднаасобнікі. Уступіла 10 гаспадарак. У большасці аднаасобнікаў не было насення, з прычыны чаго сяўбу скончылі позна, бо сеялі даволі значную колькасць зямлі. Новыя калгаснікі працавалі яшчэ па старынцы, позна выходзілі, нават былі выпадкі, калі жанчыны зусім не выходзілі на работу. Гэта запрагала работу і патрабавала многа сілы, каб прыцягнуць усіх жанчын для работы ў калгасе.

У 1932 годзе працадзень наш каштаваў 750 грам збожжавых культур, 1,4 кгр. бульбы, 500 грам гародніны і 1 руб. 57 кап. грашыма значную суму грошай мы атрымалі таму, што ў нашым распараджэнні быў млын і ад рэалізацыі садавіны.

Цяжкавата было жыць, не хапала хлеба.

Тав. СТАЛІН у сваёй прамове на студзеньскім пленуме даў разгорнутую практычную праграму дзеяння кожнага калгасніка, а таксама ўскрыў асноўныя прычыны таго, чаму ў значнай колькасці калгасаў быў нізкі ўраджай. Гэтая праграмная прамова нашага любімага правадыра многа дапамагла нам у справе карэннай перабудовы ўсёй работы калгаснага будаўніцтва. Партыя паставіла перад намі асноўную задачу—павысіць ураджайнасць соцыялістычных палёў.

Ад нашага калгаса ўдзельнічалі ўдарнікі на двух ўсебеларускіх з'ездах калгаснікаў, а таксама і на раённых з'ездах. Гэтыя з'езды далі вялікую ўпэўненасць, паднялі энтузіязм калгасных мас, далі зразумець кожнаму калгасніку, што асноўная задача наша ў гэтым годзе—атрымаць высокі ўраджай, а тав. Сталін у сваёй прамове на першым усесаюзным з'ездзе калгаснікаў прама сказаў, што мы павінны дамагчыся таго, каб нашы калгасы сталі сапраўды большэвіцкімі, а калгаснікі заможнымі. Гэты лозунг нашага правадыра тав. Сталіна стаў здабыткам усёй калгаснай масы. За яго мы змагаліся і змагаемся зараз.

Разгорнутая барацьба за ўраджай наша пачалася з вясны. Засеялі мы ў гэтым годзе куды раней мінулага, пры чым лепш апрацавалі і ўгнаілі глебу, прапалолі некалькі разоў гародніну і некаторыя збожжавыя культуры, як ячмень, жыта.

Ударная работа дала свае вынікі. Наш працадзень у 1933 годзе каштуе ўжо 3 КГР. ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР, 5 КГР. БУЛЬБЫ, 1,5 КГР. ГАРОДНІНЫ І 80 КАП. ГРОШАЙ. Гэта, значыць больш як у тры разы супроць мінулага года.

Вось ударнік ЛІ-ВУН-ЛІН С. выпрацаваў з жонкай 560 працадзён, за што атрымае 105 пудоў збожжа, 168 пудоў бульбы, 50 пуд гародніны, 448 рублёў грашыма, акрамя гэтага ён з свайго гарода сабраў 100 пудоў бульбы і больш 40 пудоў гародніны, мае карову, парасёнка і кур некалькі штук. Сям'і ў яго ўсяго 4 душы, з іх 2 малых дзяцей. Вось цяпер глядзіце, хіба-ж ён з'есць увесь хлеб? —Не. Лі-вун-лін сам на сходзе заявіў: «50 проц. гэтага хлеба я прадам, бо ён у мяне лішні».

Альбо вось другі ўдарнік—ХАЧКОЎСКІ ЯЗЭП (палак). У чацвярых з сям'ёй выпрацаваў ён 850 працадзён, за што атрымоўвае 159 пудоў збожжавых культур, 265 пудоў бульбы, 79 пуд. гародніны і 680 руб. грашыма, прычым атрымаў яшчэ добры ўраджай з свайго гарода. Мае карову, парасёнка і курэй.

Ударнік БЕЛЮСАЎ Ф ДАР (беларус) за 650 працадзён атрымоўвае 116 пуд. збожжавых культур, 195 пуд. бульбы, 56 пуд. гародніны і 520 руб. грашыма, да гэтага з свайго гарода сабраў больш 150 пудоў рознай гародніны. Мае карову, пару свіней і авечак.

Ударнік-комуніст СІ-ДЗУ-ДЗІ выпрацаваў 482 працадні, за што атрымоўвае 80 пудоў збожжавых культур, 140 пудоў бульбы, больш 40 пудоў гародніны і 351 руб. 60 кап. грашыма.

Такіх ударнікаў у нашым калгасе многа. Няма ніводнага такога калгасніка, які-б сумленна працаваў, і не меў у гэтым годзе хлеба. Наадварот, у у іх будуць вялікія лішкі для продажа.

Амаль кожны з нашых калгаснікаў да свята 16-й гадавіны Кастрычніка купіў сабе касцюм, боты, а таксама і дзецям справіў новую вопратку, боты і зімовыя паліто, а гэта ўжо гаворыць за тое, што нам ёсць за што купіць, што мы ўжо пачынаем жыць сытна і культурна.

Мы паставілі перад сабой задачу ў будучым годзе яшчэ больш атрымаць ураджай, для чаго ўзаралі пад зябліва ўвесь яравы клін, поўнасцю засыпалі насенныя фонды, забуртавалі бульбу і добра забуртавалі. Насеннем гародніны забяспечаны з лішкам.

Абавязацельствы перад дзяржавай выканалі датэрмінова па збожжу, бульбе, гародніне, мясу, малаку. Выканалі таксама грашовыя плацяжы. Зараз мы поўнасцю разлічыліся з дзяржавай.

XVI гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі святкуем з завяршэннем усіх відаў сельска гаспадарчых работ, упэўнена і рашуча ідучы па шляху да заможнага калгаснага жыцця.

Ад імя калгаснікаў калгаса «Маркавічы»: ДЖАН-ВАН ФУ, АНДРЫЖЭЎСКІ, ЛІ-ВУН-ЛІН, КРАМІН, БЕЛЮСЁЎ, ХАЧКОЎСКІ ЯЗЭП, ХАЧКОЎСКІ А., ХАЧКОЎСКІ П., ТАН-Ю-ЛІН, ШВЕЙКУС, БАРЧАНКА.

З ЧЫМ МЫ ПАДЫХОДЗІМ ДА ВЯЛІКАЙ ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА.

(ЛІСТ КАЛГАСНІКАЎ КАЛГАСА „КОМУНАР", СТАРАСЕЛЬСКАГА СЕЛЬСОВЕТА).

Наш калгас „Комунар" да XVI гадавіны Кастрычніка падыходзіць з буйнымі поспехамі на ўсіх участках нашай работы.

Вялікі Кастрычнік калгаснікі „Комунара" сустракаюць поўным выкананнем ўсіх сваіх абавязкаў перад пролетарскай дзяржавай. Першымі ў Старым сяле мы сёлета завяршылі веснавую сяўбу. Таму мы атрымалі і самы лепшы ўраджай ва ўсім сельсовеце.

Мы сёлета здалі дзяржаве 185 цэнт. збожжа, 462 цэнт. бульбы, 16 тон гародніны. Зараз узмоцнена заканчваем ільнаапрацоўку і ўжо здалі 4 цэнт. лепшага ільнавалакна дзяржаве. Да гадавіны Кастрычніка цалкам скончым здачу ільнавалакна.

Гэтыя дні мы таксама разлічыліся з дзяржавай па здачы саломы.

Наш калгас выканаў гадавы план здачы малака дзяржаве. Выканалі таксама і план здачы мяса.

Зараз мы засыпаем насенныя фонды, страхавыя, складаем кармавы баланс і непасрэдна прыступаем да размеркавання ўраджаю.

Сёлета мы будзем з хлебам, з бульбай. Наш працадзень важыць 3 кг. збожжа, 5 кг. бульбы, 0,5 кг. гародніны.

Нашы лепшыя калгаснікі-ударнікі Кастрычніцкае свята сустракаюць ідучы па шляху да заможнага жыцця. Весь, напрыклад, ПАПЧАНКА ТІМАФЕЙ адзін за 10 месяцаў мае 346 працадзён, ДАНІЛЕНКА ЯГОР 388. Яны атрымаюць: першы 65 пуд. збожжа, 109 пуд. бульбы і другі—73 пуд. збожжа і 120 пуд. бульбы, не лічачы гародніны і грошай.

Мы паставілі перад сабой задачу ў будучым годзе ўзяць ураджай у два разы больш чым у гэтым, каб ад нас і дзяржава атрымала больш і каб наш працадзень важыў таксама больш, чым у гэтым годзе.

Мы добра апрацавалі пад пасеў азіміны зямлю. Мы ў тэрмін засеялі 81,6 га азіміны. Ураджай будзе не дрэнны. Добрыя, густыя ўсходы азіміны, аб гэтым красамоўна гавораць.

Мы таксама паспяхова разгортваем зяблівае ворыва і гэтымі днямі яго завяршаем.

Кастрычніцкае свята мы сустрэнем са скончэннем усіх асенніх сельска-гаспадарчых работ.

У гэтым годзе наша свята мы будзем праводзіць у клубе, які мы самі сабе за ўласныя сродкі, ўласнымі сіламі пабудавалі.

Калгаснікі-ударнікі ПАПЧАНКА, ПРУДНІКАЎ, ДАНІЛЕНКА, УСЦІНАЎ.

За паляпшэнне якасці сельска-гаспадарчых работ! За асваенне трактараў і камбайнаў! За ахову соцыялістычнай уласнасці! Вышэй рэволюцыйную класавую пільнасць!

Е. І ВОЛКАЎ
Начальнік палітаддзела Віцебскай МТС.

Расстаўляем партыйна-комсамольскія сілы, цэментуем вытворчыя участкі і брыгады.

Совецкі саюз з краіны дробнай, разрозненай сельскай гаспадаркі стаў краінай самага буйнага ў свеце земляробства. Густая сетка совгасных і калгасных гаспадарак пакрывае неабсяжныя прасторы пролетарскай бацькаўшчыны.

Бедняцка-серадняцкія масы сялянства назаўсёды пакончылі з кулацкай эксплоатацыяй і пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі будуюць новае, светлае, соцыялістычнае жыццё.

Класавы вораг разгромлены, але канчаткова не дабіты.

«Будучы вышыбленым з калеі і разбрасаўшыся па твары ўсяго СССР гэтыя былыя людзі распаўзліся ў норы калгаснай гаспадаркі, па нашым заводам і фабрыкам, і нашым устаноўвам і гандлёвым арганізацыям, прадпрыемствам, чыгуначнага і воднага транспарта і галоўным чынам па совгасам і калгасам. Распаўзліся і ўкрыліся яны там, накінуўшы маску «рабочых» і „сялян", пры чым кой дзехто з іх пралез нават у партыю».

(Сталін).

Кулак, белагвардзеец, петлюравец, шкоднік зразумелі, што супроць калгаснага будаўніцтва, лабавой атакай зараз дзейнічаць нельга, бо атрымаеш сакрушальны адпор і таму ад прамых выступленняў супроць калгасаў яны перайшлі да развала калгасаў знутры, да дзеянняў „ціхай сапай".

Тав. Сталін на аб'яднаным студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) у праграмнай прамове аб рабоце ў вёсцы сказаў:

«Шукаюць класавага ворага па-за калгасамі, шукаюць яго ў выглядзе людзей са зверскай фізіяномяй, з велізарнымі зубамі, з тоўстай шыяй, з абрэзам у руках. Шукаюць кулака, якім мы яго ведаем з плакатаў. Але такіх кулакоў даўно ўжо няма на паверхні. Цяперашнія кулакі і падкулачнікі, цяперашнія антысовецкія элементы ў вёсцы—гэта большай часткай людзі «ціхія», «салодзенькія», амаль «святыя». Іх не трэба шукаць далёка ад калгасаў, яны сядзяць у самім калгасе і займаюць там пасады кладаўшчыкоў, загадчыкаў гаспадарак, рахункаводаў, сакратароў і г. д.»

Для таго, каб разгледзець такога ворага, кожны работнік, кожны камуніст павінен быць узброен пролетарскай пільнасцю, той самай якасцю, якая зараз вельмі неабходна большэвікам.

Машынна-трактарныя станцыі, сотні і тысячы якіх пакрываюць Совецкі саюз—галоўнейшы вагар перабудовы сельскай гаспадаркі на соцыялістычны лад.

Палітаддзелы МТС арганізаваныя па пастанове студзеньскага пленума —гэта моцнае палітычнае папаўненне.

12 кастрычніка—дата пачатка работы палітаддзела Віцебскай МТС.

Сёння ў дзень святкавання XVI гадавіны вялікага Кастрычніка мы маем магчымасць падвесці некаторыя вынікі нашай работы.

З чаго мы пачалі? А пачалі мы з вывучэння становішча калгасаў. За гэты параўнальна не зусім вялікі час, работнікі палітаддзела даскакала азнаёміліся з жыццём 4 калгасаў: „Іскра", „Мопр", „Звязда" (Сялюцкага сельсовета) і «Чырвоная армія» (Елагінскага сельсовета).

Па надзяленні калгаснікаў цёлкамі, палітаддзел прымае належныя меры. Крэдыты на набыццё цёлак вызначаны і размеркаваны паміж калгасамі. Кожны бескароўны калгаснік атрымае цёлку.

Віцебская МТС на працягу доўгага часу не выходзіла з буйнейшых прарываў і таму перабудова работы, знішчэнне прарываў патрабуе асаблівых сіл і большэвіцкай напорыстасці.

Ва ўсёй гэтай напружанай рабоце з першых крокаў палітаддзелу дапамаглі гарком партыі і гарсовет. Не было памяшкання, гарком партыі прапанаваў фракцыі гарсовета прадставіць палітаддзелу абсталяванае памяшканне. І святкаванне XVI гадавіны Кастрычніка палітаддзел МТС праводзіць у абсталяваным памяшканні, мае свой чырвоны куток.

Гарсовет забяспечыў нас пішучай машынкай і сродкамі на прадмет набыцця перасовачнага транспарта.

У радзе калгасаў, калі палітаддзел распачынаў работу, не было старшынь, гарком партыі даручыў тав. АСІНСКАМУ (загадчык аддзела кадраў г. к.) укамплектаваць кадрамі раён дзеяння МТС. Тав. Асінскі самым добрасумленным, уважлівым чынам аддаўся да гэтай вялікай важнасці справы і рад комуністаў накіраваў у распараджэнне палітаддзела.

Унутры самаго апарата МТС палітаддзел сустрэўся з радам агіднасцей. Працоўная дысцыпліна—расхлябана. Механік ІВАНОЎ—член партыі не добрасумленна адносіўся да работы, зацягваў наўмысля рамонт трактароў. Старэйшы механік БАЯРУНАС не аперацыйна кіруе тэхнічнымі сіламі. Па яго віне трактары днямі стаялі не рамантаванымі.

На катэгарычнае папярэджанне палітаддзела адрамантаваць трактар на працягу 4 гадзін, Баярунас адказаў, што гэта зусім магчыма і што трактар будзе адрамантаван, а праз 4 гадзіны паведаміў, што ўсё зроблена. Калі-ж на трэці дзень праверылі, трактар аказаўся неадрамантаваным. Ці-ж гэта не своеасаблівы спосаб сабатажа?

Або вось агранома ПРАНЕВІЧ на Елагінскім вытворчым участку сістэматычна не выконваў распараджэнні дырэктара, злосна не даваў звестак, не дапамагаў калгасу і не прымаў ніякіх мер да таго, каб ліквідаваць абязлічку, асабліва ў галіне жывёлагадоўлі.

Старэйшы агранам ЛАЛО замест таго, каб мабілізаваць аграномічныя сілы на знішчэнне недахопаў і прарываў, днямі прасіджваў у канцылярыі, пісаў і перапісваў, лічыў, вылічваў і пералічваў...

Палітаддзел сустрэўся і з другім відам сабатажнікаў, дзейнічаючых у адкрытую. Прыкладам такіх з'яўляецца МІХАЙЛАЎ, які адмовіўся паехаць у калгас. Дзіўна, чаму зараз гэты Міхайлаў атрымаў пасаду ў гарсовеце. Ці вось другі, Назараў, атрымаўшы пуцёўку ад гаркома на работу МТС заняўся «перагаворамі», паставіў „ультыматум", каб яму далі пасаду, якую ён жадае. Усе гэтыя справы Назарава, Міхайлава і ім падобных—выраз сабатажніцтва, нежадання пайсці на работу ў МТС—гэты адказнейшы ўчастак.

Палітаддзел на ўзняццё працоўнай дысцыпліны звярнуў самую сугубую ўвагу. Тэхнічна-аграномічныя сілы спушчаны непасрэдна ў брыгаду, на вытворчы ўчастак.

„Калгасы, іх соцыялістычная форма арганізацыі гаспадаркі ... гуць пакаваць цуды гаспадар... будаўніцтва, калі на чале стаяць сапраўдныя рэволюцыянеры большэвікі, комуністы" (Сталін).

Падборам, высоўваннем і выхаваннем кадраў палітаддзел зараз ушчыльную займаецца.

За зімовы час МТС павінна падрыхтаваць і перападрыхтаваць каля 200 чалавек: механікаў, трактарыстаў, калёсаважатых, старшынь калгасаў, брыгадзіраў, рахункаводаў, конюхаў і інш. спецыялістаў.

Палітаддзел разгортвае работу арганізацыі курсаў і адбору ... калгаснікаў-ударнікаў на гэтыя курсы. Выхаванне сапраўды большэвіцкіх кадраў, а гэта—першачарговая ўмова для паспяховага ажыццяўлення наказа правадыра нашай партыі т. Сталіна:

„Зараз задача састаіць у тым, каб умацаваць калгасы, арганізацыйна, вышыбіць адтуль шкодніцкія элементы, падабраць сапраўдныя правераныя большэвіцкія кадры для калгасаў і зрабіць калгасы сапраўды большэвіцкімі".

Ва ўсёй гэтай напружанай і ўдарнай рабоце па арганізацыі курсаў ... беспячэнне іх матэрыяльна, а таксама кваліфікаванымі настаўніцкімі сіламі палітаддзел чакае дапамогі ад гаркома партыі, совецкіх і грамадскіх арганізацый.

XVI гадавіну Кастрычніцкіх свят МТС сустрэла з папаўненнем машына-трактарнага парка. 7 новых сталёвых коняй па прозвішчу «Інтэр...» атрымала МТС.

Пры Віцебскай машынна-трактарнай станцыі пачала функцыянаваць машынна-трактарная майстэрня, прызначэнне якой—забяспечваць рамонт трактараў і сельска-гаспадарчых машын трох раёнаў дзеяння МТС: Віцебскі, Суражскі і Лёзнянскі, а таксама рамонт трактараў і сельска-гаспадарчага інвентара калгасаў і совгасаў Віцебска.

Разгортванне партыйна-масава выхаваўчай работы—вось чым зараз асабліва займаецца палітаддзел. Даць элементарную палітычную пісьменнасць кожнаму комуністу, комсамольцу, актывісту-калгасніку і калгасніцы такая неадкладная задача. Для гэтага палітаддзел непасрэдна ў калгасах арганізоўвае сетку партыйнай асветы ў колькасці 16 школ. Вылучан прапагандыст-арганізатар, які на працягу навучальнага года будзе стала займацца работай сеткі партасветы ў калгасах.

Пры МТС і МТМ арганізавана кандыдацкая школа і гурток па вывучэнні ленінізма. І школай і гуртком кіруюць непасрэдна работнікі палітаддзела.

З комуністамі і комсамольцамі адзінкамі, якіх не прадстаўляецца магчымым уцягнуць у школы партыйнай сеткі, раз у дэкаду на працягу семігадзіннага рабочага дня будзе праводзіцца семінар па наступных прадметах: на вывучэнне палітыкі 4 гадзіны матэматыкі і белмовы—3 гадз. 2 гадз. на вывучэнне тэхнікі.

Партыйныя і комсамольскія ячэйкі калгасны актыў—вось сіла, на якую палітаддзел абапіраецца ў сваёй штодзённай рабоце.

Уся ўвага палітаддзела сканцэнтравана зараз на тым, каб лепш расставіць лепшыя сілы, сцэментаваўшы імі брыгады, вытворчыя ўчасткі, згуртаваць партыйна-комсамольскі і беспартыйны калгасны актыў вакол палітаддзела.

Наша ўся работа падпарадкавана выкананню задачы пастаўленай т. Сталіным: Зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а ўсіх калгаснікаў заможнымі.

Калгасніца Марына Восіпава святкуе Кастрычнік.

— Мама, у нас у калгасе ставяць радыо! — Будзем слухаць, як у вялікіх гарадох будуць святкаваць свята Пролетарскай рэволюцыі. Будзе радасна і нам у гэтае свята. Калгас наш сёлета упяршыню гадавіну Кастрычніка адзначае як ніколі. Для дзяцей наладжваецца ранішнік—будуць гульні і смачныя снеданні, а вечарам пасля ўрачыстай часткі, для ўсіх калгаснікаў будзе добрая вячэра.

Весела будзе! Мы-ж у гэтым годзе так многа хлеба атрымаем, бульбы, столькі хлеба ў нас ніколі не было— расказваюць падлёткі Грышка, Ганна і Настасья сваёй старэючай маці ВОСІПАВАЙ Марыне.

— Вось цёлку, ды якую-ж добрую цёлку калгас нам выдаў, пад кормім, а пракарміць ёсць чым, будзе яна хутка каровай.

„А мне чаравікі—прэмію за добрую работу калгас хіба не прызначыў— ўстаўляе сваё слова Ганна".

— „А мне бялізну таксама выдае калгас не за тое, што быў гультаём, а за тое, што добра работаў"—гаварыцца Грышуха,—аб гэтым усе калгаснікі гаварылі, калі прызначалі мне прэмію.

* * *

У мінулым годзе ў гэтым калгасе імя Варашылава, Селюцкага сельсовета, кулакі Табуновы, Ганчаровы, Дзямідавы, пралезшыя на камандныя вышыні—разбуралі, падрывалі калгасную гаспадарку. Многа бед калгасу натварыла ашалелае кулачча, загубілі цяглавую сілу, размеркаванне ўраджая правалі па кулацкай ураўнілаўцы, без усякага ўліка. Лодыры, гультаі, кулацкія прыхлебацелі разбазарылі хлеб, бульбу.

Пры дапамозе актыва калгаснікаў кулачча было выкрыта і выкінута з калгаса, хаця і не доўга ім прышлося арудаваць, аднак следы іх шкодніцкай работы засталіся глыбокія і наладжваць іх у весну добрасумленным калгаснікам было вельмі цяжка. На дапамогу калгасу партыя кінула лепшых ударнікаў-пролетараў з горада для арганізацыі і наладжвання работы. Сельсоветам быў арганізаван буксір з суседніх калгасаў і працоўных аднаасобнікаў і прарыў быў ліквідаван, калгас справіўся з веснавой сяўбой, з уборкай, выканаў у тэрмін сяўбу азімых і разлічыўся з дзяржавай і па натураплаце.

У корані змянілася працоўная дысцыпліна. Папулярызацыя рашэнняў партыі і ўрада аб арганізацыйна гаспадарчым умацаванні калгасаў, прамова тав. Сталіна на першым з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў змянілі погляд калгаснікаў на работу ў калгасе і далі вынікі па яго ўмацаванні і добрабыце калгаснікаў. Калгаснікі на справе ўпэўніліся, што закон партыі і ўрада непахісны. Ударнікі кажуць:—«У нас будуць хныкаць пра дрэннае жыццё тыя, хто больш на базары „працаваў", а не ў калгасе, яны яшчэ і сёння за тое, каб стварыць рэзервныя фонды для „маючых патрэбу".

Калгас па пастанове агульнага сходу рашыў стварыць пяціпроцантны фонд для патрэб дзіцячых устаноў і гаспадарчых патрэб калгасу.

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі калгас наладжвае сваё гаспадарчае становішча. Набыта пяць коней у гэтым годзе, пабудавана стайня і скотнік для абагуленай жывёлы, бульбасховішча на 4 тысячы пудоў бульбы.

Да свята завершан план зяблівага ворыва. Азімыя ўсходы па ўсіх участках вельмі добрыя. Бадзёры настрой у калгаснікаў. Дзякуюць яны партыю, што дала ім магчымасць хутка па збавіцца ад шкоднікаў, вылучыла добрага кіраўніка т. Баса і дала магчымасць у гэтым годзе атрымаць добры ўраджай і столькі хлеба, колькі яшчэ ні разу дагэтуль не атрымоўвалі.

Недарма Восіпава Марына кажа, падцвярджаючы словы дзяцей: «Калі мы атрымліваем свой хлеб поўнасцю, то гэта дзякуючы таму, што мы выгналі з калгаса кулакоў, што нам дапамагла наша ўлада, паслаўшая нам на дапамогу сваіх лепшых работнікаў. Наш цяперашні старшыня тав. Бас і добры кіраўнік і добры чалавек.

— Што б я рабіла цяпер, калі-б не калгас. Жывучы ў сваёй аднаасобнай гаспадарцы мы ніколі не мелі на год хлеба. Сем'я ў нас была вялікая—9 душ, зямлі ўсёй удобнай і няўдобнай 4 га. Земля вельмі нізкая і радзіла хлеб надта дрэнна. Прыходзілася прадаваць апошнюю кварту малака, каб купіць хлеба, дзеці заставаліся без малака. Мужык кідаў гаспадарку і ўхадзіў на работу. Вось так цяжка і жылося ўвесь час. А пасля яшчэ горш стала—памёр мужык і куды-б мне было б дзявацца з малымі дзецьмі?

А вось у калгасе нават і падлёткі мае зарабілі па 161 працадні. Работаем мы ў чацвярох. Дзеці ў мяне працавітыя, на работу самі спяшаюцца, мяне іх пасылаць не прыходзіцца. Ніводзін дзень не прагулялі. Трое вучацца, адна скончыла пяцігодку, другая перайшла ў пятую групу і трэцяя наведвае школу...».

Ганарыцца Марына сваімі дзецьмі. Прэміруюць іх за ўдарную працу ў калгасе ў дзень свята XVI гадавіны Кастрычніка. Святошная радасць дзяцей перадаецца старой Марыне і расце ў ёй упэўненасць у заможнае культурнае калгаснае жыццё, якое яна пачынае ўжо на справе адчуваць.

А. СІПКО.

Поспехі першага года другой пяцігодкі пацвердзілі, што калгасная справа непераможна. Калгаснікі і калгасніцы! Усямерна ўмацоўвайце калгасны лад! Даб'ём рэшткі кулацтва. Няхай жыве саюз рабочых і селян, будуючых соцыялізм!

XVI гадавіну Кастрычніка адзначым новым уздымам соцспаборніцтва і ўдарніцтва, аўладаннем тэхнікай, шырокай мабілізацыяй рабочых мас на пераможнае завяршэнне планаў 4 квартала.

Соцыялістычны транспарт выходзіць на шырокую дарогу.

На волаку «росквіта» старой Расіі паэт Добралюбаў адзін з сваіх сатырычных вершаў закончыў так:

„Не пойдет наш поезд
Как идет немецкий“.

У гэтых словах поэта Добралюбава гучэў прыгавор спробам царскай Расіі перашчагаляць Эўропу. Царскаму ураду так і не ўдалося дагнаць немецкі цягнік.

— Маламоцныя паравозы—«авечкі» і „шчукі“ хадзілі па пуцях.. Не пазнаць былую губернскую станцыю Віцебск. Яна так далёка ўшла за гады пролетарскай рэволюцыі, як неба ад зямлі—гавораць старажылыя чыгуначнікі.

У два разы вырас віцебскі чыгуначны вузел. Пуць рабочага парка ледзь умяшчаў 40 вагонаў. Пуці сённешніх паркаў свабодна прымаюць цягнікі ў сто вагонаў. На месцы Міхайлоўскіх могілкаў размясціўся Арлоўскі парк.

Ніякай электрафікацыі і ў паміне не было. Цемра не праходная панавала на станцыі ўначы. Многа чалавечых ахвяр каштавала начная работа станцыі. Сёння на станцыі пражэктарнае асвятленне.

„Авечкі“ і „шчукі“ уходзяць у вобласць прэдання. Ім на змену з совецкіх заводаў прыходзяць магутныя паравозы. Амаль усю цягавую работу вузла цяпер выконваюць „эхаўкі“.

У гэтым годзе Віцебскі вузел атрымаў новы атрад магутных паравозаў серыі «ЭМ». Іх прыйшло 19. Яны вядуць цягнік ужо не ў 800 тон, як «шчукі» а ў 1600 тон.

Электрафікаваны і механізаваны амаль усе працэсы рамонта цягавога і рухавога склада.

З маленькай губернскай станцыі, Віцебскі вузел ператварыўся ў важнейшую станцыю МББ, выконваючы 47 проц. усёй работы дарогі.

Калі яшчэ ў 1929 годзе станцыя ВІЦЕБСК пераработвала ў суткі 4000 — 5000 вагонаў, то сёння яна ўжо пераработвае 8000—9000. Калі прастой транзітнага (праходзячага) вагона ў кастрычніку мінулага года складаў 9,3 гадзіны, то ў кастрычніку бягучага года—5,8 гадз. Які-б вымернік мы не ўзялі—усюды рост, усюды вялікі скачок наперад.

Дасягненнямі ў апошні час Віцебскі вузел абавязан палітаддзелу, вялікая заслуга якога састаіць у тым, што ён за кароткі час сваёй работы здолеў мабілізаваць вытворчую актыўнасць мас і накіраваць яе на баявую рэалізацыю гістарычных пастаноў ЦК і Совнаркома аб транспарце, безлітасна ламаючы на сваім шляху сабатажнікаў перабудовы.

Сёння ў XVI гадавіну Кастрычніка кожны чыгуначнік павінен паставіць перад сабою як баявую задачу—сваю работу арганізаваць так, каб дабіцца паказальнікаў, якія маюць лепшыя ўдарнікі вузла: машыніст КОТНЕЎ, змазчык МІСУРАЧІН, слесар САРОКІН, аглядчык МАЦВЕЯЎ, стрэлачнік ВІНАРАДАЎ, саставіцель МАСЛАКОЎ, кандуктар КРЫШТАФОВІЧ, вагаўшчык СЦЯПАНАЎ, грузчык ШАЛАЙ, і пуцеец ШПАРОЎСКІ.

Праведзеныя палітаддзелам паліт масавыя дні далі сотні рацыяналізатарскіх рабочых прапаноў. Сярод іх найбольш каштоўнымі з'яўляюцца прапанова рабочага аўтаматчыка паравознага дэпо тав. КАНДРАЦЦЕВА аб устанаўленні кантрольнага стала для апрабавання аўтатармазоў; маладога слесара паравознага дэпо комсамольца АНДРЭЕВА аб электафікацыі донкратаў для пад'ёмкі паравозных тэндэраў; рабочага вагоннай майстэрні тав. СКІРГАЙЛА ўстанавіўшага прэс для высіскання дзірак і прэсоўкі ўтулак.

Толькі ў нас, у Совецкім саюзе праца ператварылася з цяжкай павіннасці ў радаснае творчаства.

Мільённая армія совецкіх чыгуначнікаў высунула немала герояў-вынаходцаў. Усяму свету вядомы такія вынаходкі совецкіх чыгуначнікаў, як тармазы КАЗАНЦАВА і МАТРОСАВА, дэфектаскоп КАРПАВА, інжэктар ТРАФІМАВА, акумулятар РАЖНОВА. Развержаны залатнік Трафімава знаходзіць дапасаванне не толькі ў Совецкім саюзе. У Германіі гэтым залатнікам фірма „Геншаль“ снабжае ўсе паравозы. Вынаходцы совецкай аўтасцэпкі МІТРОШНІЧАНКА і КАВАЛЬ пабілі сусветна-вядомую германскую фірму „Шарфенберг“.

Тэхнік віцебскага дэпо ТРАФІМАЎ вынайшоў прыбор, маючы ўсесаюзнае прымяненне—прыбор для перакаткі безрабёрных калёсных пар.

Наш совецкі чыгуначны транспарт з'явіўся і з'яўляецца актыўным фактарам у развіцці ўсёй народнай гаспадаркі, забяспечваючы шырачэйшы размах будаўніцтва па ўсёй тэрыторыі Саюза, умацаванне гаспадарчага і культурнага пад'ёма нацыянальных рэспублік і далёкіх ускраін, садзейнічаючы знішчэнню процілегласцяй паміж горадам і вёскай, і ўмацоўваючы абараназдольнасць пролетарскай дзяржавы.

Наш совецкі транспарт, скончыўшы пяцігодку ў тры гады, прайшоў шлях роўны шляху пройдзенаму амерыканскім транспартам за 13 год.

Наш совецкі транспарт выходзіць з вузкага месца на шырокую дарогу. Грузазварот нашых чыгуначных дарог павялічыўся ў параўнанні з даваенным у два разы, у той час, як Германія па грузазвароту дасягнула толькі 54 проц. даваеннага ўзроўня.

Магутныя совецкія паравозы вядуць саставы совецкіх вагонаў, гружаныя прадукцыяй гігантаў пяцігодкі, соцыялістычнага ўраджая.

Пастанова Цэнтральнага камітэта партыі і Совнаркома аб перабудове работы транспарта і арганізацыя палітаддзелаў на транспарце адкрылі семафор для далейшых перамог соцыялістычнага транспарта. Уступаючы ў XVII гадавіну пролетарскай рэволюцыі мы можам з гонарам заявіць:

„Не идет немецкий поезд
Как идет советский“.

І не пойдзе! Германія сённешняга дня па пасажырскіх паравозах стаіць на ўзроўні 1909 года. СССР па пасажырскіх паравозах моцна стаіць на першым месцы ў свеце.

ГР. МАКСІМАЎ.

ЗАМАЦОЎВАЮЧЫ ДАСЯГНЕННІ, УЗОРНА СУСТРЭНЕМ ДРУГІ ГОД 2-й ПЯЦІГОДКІ.

У 1930 годзе на ўсебеларускай народна-гаспадарчай выстаўцы наша акулярная фабрыка атрымала дыплом за большэвіцкую работу па аслабаненні фабрыкі ад імпартнай залежнасці і за добрае абсталяванне яе.

У 1932 годзе рабочы калектыў нашай фабрыкі за датэрміновае выкананне першага квартала, паляпшэнне якасных паказальнікаў, зніжэнне сабекошта атрымаў ад гарадскога камітэта партыі і гарпрафсовета і рэдакцыі „Віцебскага пролетарыя“ пачэсную грамату і 2 тыс. руб.

У 1933 годзе мы атрымалі за датэрміновую рэалізацыю і ахоп усіх рабочых і работніц пазыкай «Першага года другой пяцігодкі» пераходны сцяг гарсовета. У гэтым-жа годзе мы атрымалі пераходны сцяг гарпрафсовета і рэдакцыі «Віцебскага пролетарыя», за пасляховае правядзенне ўсіх сельска гаспадарчых работ у сваёй прыгараднай гаспадарцы.

Для лепшай падрыхтоўкі да 16-й гадавіны Кастрычніка, забеспячэнне поўнага выканання прамфінплана, яшчэ большага паляпшэння якасці нашай прадукцыі, пастанавілі мы выклікаць на соцспаборніцтва заводы „Чырвоны металіст“ і скурзавод. Мы ўзялі абавязак выканаць прамфінплан з усімі яго паказальнікамі, галоўным чынам, палепшыць якасныя паказальнікі, знізіць сабекошт, стварыць уласную харчовую базу. Сёння, у дзень 16 гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі мы можам з усёй упэўненасцю сказаць, што ўзятыя намі абавязкі мы з гонарам выканалі.

З часу абвяшчэння спаборніцтва паміж заводамі і ўступлення ў перадкастрычніцкую пераклічку і падрыхтоўку да злёта ўдарнікаў якасці мы разгарнулі ўнутры фабрыкі паміж цэхамі, брыгадамі, паасобнымі ўдарнікамі спаборніцтва на атрыманне пераходнага сцяга трыкутніка для цэха і пераходнага бюста т. СТАЛІНА для лепшай брыгады.

На аснове замацавання вынікаў чысткі партыйнай арганізацыі, правільна расставіўшы партсілы па цэхах і ўчастках, у аналогічным парадку была перабудавана і прафработа. Устанавілі цвёрдую жалезную дысцыпліну, мы дабіліся знішчэння прагулаў, спазненняў на работу, а таксама і цякучасці рабочай сілы. Соцспаборніцтвам ахоплена з усёй колькасці рабочых 484—322 чалавека, з якіх мы маем герояў пяцігодкі 9, лепшых ударнікаў 74, ударнікаў 239. Гаспразрахунковых брыгад мы маем 12, з ахопам 161 чал., якія выканалі план за трэці квартал на 104,29 проц.

Брыгада арганізаваная ў часе чысткі партыйнай арганізацыі на чале з брыгадзірам т. ЗЫКІНЫМ (шліфавальны цэх) выканала план трэцяга квартала на 145,8 проц., прадукцыйнасць на 124,4 проц. Гэтых паказальнікаў брыгада дабілася на аснове паляпшэння якасці прадукцыі і зняншэння брака.

У сэнсе аўладання тэхнікай мы дабіліся: асваення складанага абсталявання фабрыкі, у выніку чаго мы не маем прастояў і аварый. Асвоен выраб штампаў і прыстасаванняў складаных канструкцый прывазімых раней з-за мяжы, чым мы пазбавіліся ад імпартнай залежнасці, што дала магчымасць аслабаніцца і ад апошняга „імпарта“—замежнага спецыяліста, які каштаваў дзяржаве валюты.

Мы асвоілі і вырабляем складаныя акуляры для чырвонага паветранага флота, чым пазбавілі нашу пролетарскую дзяржаву ад увоза іх з-за мяжы. Кожная ўвозімая пара акуляраў каштавала 6—7 доларaў. Тэхвучобай ахоплена 300 рабочых.

Па сталінскаму паходу мы зрабілі наступнае: ашклілі 200 рабочых кватэр, прадаставілі работніцы-ударніцы новую кватэру, адчынілі сталоўку для ІТР, азялянілі пальмамі зборачны цэх. 40 лепшым ударнікам даставілі апал на кватэры.

У прыгараднай гаспадарцы рабочы калектыў фабрыкі адпрацаваў 7203 чалавекадзён. Па ахове ўраджая рабочыя дзяжурылі 799 чалавеканачэй.

Уся гэта праца праведзена пад канкрэтным большэвіцкім кіраўніцтвам гарадскога камітэта партыі і парткалектыва фабрыкі.

Прамфінплан за 10 месяцаў выкананы фабрыкай на 103,22 проц. Прадукцыйнасць працы за 9 месяцаў—113, 34 проц., зніжэнне сабекошта за 9 месяцаў замест мінус 1,1 проц. па плану, маем мінус 7,12 проц., што дае эканоміі ў 240 тыс. руб. Зніжэнне брака за 9 месяцаў супроць плана мы маем на 5,1 што складае 12245 руб. эканоміі. Колькасць рабочых па плану 524 чал., фактычна мы маем 484, што складае 92,36 проц. Гэта сведчыць аб тым, што мы рабочы дзень ушчыльнілі поўнасцю. Фонд заработнай платы за 9 месяцаў скарыстан на 88,61 проц.

Усе сельска-гаспадарчыя работы ў прыгараднай гаспадарцы скончаны. Мы атрымалі 595 тон рознай гароднінны. Праведзена поўнасцю заквасна капусты ў колькасці 50 тон. Палепшана грамадскае харчаванне і поўнасцю забяспечана гароднінай, выдана рознай гароднінны на кожнага рабочага 85,5 кгр. і на ўтрыманца 54,5 кгр. Гэтым самым мы стварылі ўласную харчовую базу, што значна спрыяла канчатковай ліквідацыі цякучасці рабочай сілы і забеспячэнню выканання прамфінплана.

Гэтых перамог мы дабіліся на аснове бязлітаснай барацьбы з класава варожымі элементамі, трапіўшымі на нашу фабрыку, прыкрыўшыміся рабочай блузай, якія праводзілі сваю шкодную антыпролетарскую дзейнасць. Рашуча ачысціўшыся ад гэтых элементаў, мабілізуючы актыўнасць рабочых і работніц на выкананне ўзятых абавязкаў, разгарнулі індывідуальнае соцыялістычнае спаборніцтва, праводзілі штодзённы ўчот эфектыўнасці работы, ажыццяўляючы на справе 6 гістарычных указанняў т. СТАЛІНА, скарыстоўваючы вышэйшыя соцыялістычныя метады і формы работы.

Поруч з маючыміся поспехамі нельга не адзначыць і нашы недахопы, на знішчэнне якіх патрэбна яшчэ больш мабілізавацца ўсяму рабочаму калектыву. А недахопы наступныя: фабрыка не мае ўласнай паравой установкі, што ўскладняе тэхналагічны працэс і павялічвае выдатак апалу на адзінку выраблямай прадукцыі. Няпоўнасцю асвоена апрацоўка новых вырабаў: аптычнага шкла, як меніскі, тарычанскіх і цыліндрычных.

Брак па апрацоўцы аптычнага шкла з'яўляецца яшчэ даволі высокім, які ніяк не можа нас задаволіць. З мэтай баявой падрыхтоўкі да другога года другой пяцігодкі і пасляховага завяршэння апошняга рашаючага квартала 1933 года мы прапануем працягваць агульна-гарадскае спаборніцтва прадпрыемстваў, АБВЯСЦІЦЬ КОНКУРС НА ЎЗОРНУЮ СУСТРЭЧУ ДРУГОГА ГОДА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ.

З свайго боку мы абавязваемся поўнасцю ліквідаваць маючыяся ў нашай рабоце недахопы, дабіцца поўнага завяршэння праграмы апошняга квартала і ўступіць у другі год другой пяцігодкі з рашаючымі перамогамі на ўсіх участках нашай работы.

Па даручэнні агульнага сходу рабочага калектыва фабрыкі, ліст падпісалі: трыкутнік фабрыкі ГАЛУЗАЎ, ГАЛАНЦАЎ, БАРАНОЎСКАЯ, лепшыя ўдарнікі, героі першай пяцігодкі РОЗЕНФЕЛЬД, АРШ, НАРЦІШКА, ЗЫКІН, ЮДОВІН, ШАПІРА, МАМОНКА, СУХОРСКАЯ, ПЛОТКІНА, СЕРГЕЕНКА, МЕЕРЗОН і ФРАДКІН.

БАРАЦЬБА ЗА АСВАЕННЕ ТЭХНІКІ, ЗА АУЛАДАННЕ НОВЫМІ МЕТАДАМІ РАБОТЫ—УДАРНАЯ ЗАДАЧА.

ВЫПЕСТАВАНАЯ ЛЕНІНСКІМ КОМСАМОЛАМ.

Бліскучыя часткі машыны адлюстроўваць кожны яе рух. Яна работае хутка, але добра, уважліва праглядае работу. Лоўка перахоплівае пінжак з 15 аперацыі, прастрачвае верхнюю кішэнь і хутка перадае далей ў наступную аперацыю. Ніводзін яе рух не прападае дарма. Усё разлічана на выкананне і перавыкананне прамфінплана. Кожны дзень пры падліку пасля працы, лічба выпрацоўкі ўздымаецца ўсё больш, дасягае да 350—400 адзінак у дзень (замест планавых 280). Усю ўвагу яна аддае рабоце, уважліва сочыць за кожным рухам машыны. Чыста адпаліраваная машына (гэта таксама яе работа), адбівае яе твар і вы адразу пазнаеце, што гэта працуе т. АСТАШКО—лепшая ўдарніца касцюмнага цэха, фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі».

Вырасла яна ў беднай сялянскай сям'і У 1918 годзе пасля смерці бацькоў застаўшыся сіратой «добрыя людзі» яе прыючілі. Васьмігадовай дзяўчынцы прыходзілася выконваць абавязкі нянькі. Гэта работа займала ўвесь яе дзень. Уставала яна раніцой, калі яшчэ не ўсходзіла сонца, а кладася спаць (на падлогу), калі сонца ўжо апускалася за лес.

Але хутка ёй стаў вядомы іншы шлях, яна была пазбаўлена ад свайго цяжкага становішча, ад эксплоатацыі „добрых людзей“. Кастрычніцкая рэволюцыя адчыніла новы шлях для жыцця безнаглядных і беспрытульных дзяцей, праз арганізацыю дзіцячых дамоў, комун і інш.

Узнаўшы аб існаванні ў горадзе дзіцячай комуны для беспрытульных і безнаглядных дзяцей Асташко паступае туды. Выхоўвалася яна там да 1925 г. Была там прэміявана і атрымала характарыстыку: «Лепшая выхаванка, дысцыплінаваная, прымала самы актыўны ўдзел у грамадскім жыцці комуны».

Пасля комуны паступіла ў швейны фабзавуч, добра яго скончыла, атрымаўшы прэмію, і ў 1930 г. паступіла працаваць на фабрыку «Сцяг індустрыялізацыі».

Першы час пасля перабудовы сістэмы работы фабрыкі, першы ўчастак другой пінжачнай ленты, сістэматычна невыконваў свой прамфінплан. Прычыны? Яны былі ў тым, што на ўчастку была дрэнна арганізавана праца, працоўная дысцыпліна адсутнічала, масавай работы сярод рабочых не праводзілася. І ўчастак выпускаў 250 адзінак у змену замест планавых 280.

70 проц. рабочых участка складала моладзь, у большасці комсамольцы. Адсюль ясна, што імённа комсамольцы, іх авангардная роля на вытворчасці вырашала лёс выканання прамфінплана. Але паасобныя комсамольцы не ўявілі сабе гэта. Комсамолка РАЙХЛІНА сістэматычна парушала працдысцыпліну: спазнялася на працу, у час працы размаўляла, кідаючы работу.

Комсамольская ячэйка рашыла ператварыць увесь участак у маладзёжны, 18 верасня гэта было афармлена, і брыгадзе была прысвоена імя ЦК ЛКСМБ. Брыгадзірам вызначылі тав. АСТАШКО.

На вытворчай нарадзе брыгада паставіла перад сабой задачу, каб да XV-годдзя ЎсеЛКСМ выйсці з поўнай ліквідацыяй адставання. Праз кароткія нарады т. Асташко пачала штодзённа праводзіць работу па ўкараненню змена-сустрэчнага планавання. Тут выкрываліся ўсе недахопы, намячаўся шлях іх ліквідацыі. Лепшыя работніцы ўчастка ўзялі пад калектыўны ўплыў работніцу першай рукі ЛЫСОЎСКУЮ і ПУКАВУ, у апошні раз на сходзе папярэдзілі РАЙХЛІНУ, СМАЛЯНСКУЮ і ЧОРНАМОРДЗІКА, што, калі яны не выправяцца, дык будуць занесены на чорную дошку. Але да гэтага не патрэбна было прыбягаць, бо яны выправіліся і знішчылі брак.

Зараз гэта брыгада лепшая па цэху, а таксама па фабрыцы. З 18 верасня па 1 кастрычніка брыгада выканала прамфінплан на 106,8 проц. З 1 кастрычніка па 1 лістапада на 102 проц. (неабходна ўлічыць два дня прастоя з-за адсутнасці тока).

За ўдарную работу, за знішчэнне брака і пераробак АСТАШКО неаднаразова прэміявалася.

Асабліва Асташко пачала праяўляць узорныя тэмпы работы ў час падрыхтоўкі да XV гадавіны ЎсеЛКСМ і XVI гадавіны Кастрычніка.

Прэзідыум цэнтральнага выканаўчага камітэта саюза ССР у азнайменне XV годдзя ўсесаюзнага комуністычнага саюза моладзі, пастанаўляе ўзнагародзіць орданам Леніна 34 лепшых кіраўнікоў і перадавых работнікаў комсамола. У 31 абзацы гэтай пастановы адзначана: «Асташко Н.—работніцу Віцебскай швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» ударніцу, тры разы прэміяваную за перавыкананне нормы і добрых паказальнікаў па якасці, арганізатара маладзёжнай ленты, ударніцу па аўладанні тэхнікай, члена фабрычнага камітэта комсамола наградзіць орданам Леніна»...

Я прыкладу ўсе сваё намаганні,—кажа т. Асташко, каб "наша брыгада і на далей заўсёды была самай перадавой на фабрыцы. Я абавязваюся не дапусціць ніводнай пераробкі, ніводнага брака, дабіцца перамогі ў выкананні прамфінплана 4 квартала выканаўшы яго на 150 проц. Гэту задачу пад кіраўніцтвам фабрычнага комсамола і партыйнай арганізацыі я з гонарам выканаю.

...І зноў яна пры машыне. І зноў яна лоўка перахоплівае пінжак з 15 аперацыі, прастрачвае верхні карман і хутка перадае работу наступнай аперацыі. Так-жа, як і раней бліскучая машына адлюстроўвае яе твар.

Асташко выхаваў Ленінскі комсамол. Такімі як яна можа і павінна ганарыцца ўся комсамольская арганізацыя Віцебшчыны.

А. БРЫСКІН.

ПЕРАМОГА ЛЕНІНСКАИ НАЦЫЯНАЛЬНАИ ПАЛІТЫКІ.

Рускі царызм, які пільна ахоўваў інтарэсы абшарнікаў і буржуазіі і ў галіне культурнага развіцця краіны прытрымліваўся палітыкі, яскрава выражанай у народнай прыказцы: «Чым мужык цямней, тым пан багацей». Імённа пагэтаму на працягу стагоддзяў дарэволюцыйнага часу пісьменнасць, як неабходны сродак для аўладання навукай сама навука, усе сродкі і ачагі культуры—з'яўляліся здабыткам толькі нязначнай горсткі насельніцтва—пануючых класаў памешчыкаў і буржуазіі. Мільёны працоўных мас былі пазбаўлены гэтай „роскашы“. Царызм не даваў ніякай магчымасці працоўным авалодваць пісьменнасцю, навукай, бо баяўся ператварэння навукі ў зброю барацьбы працоўных супроць яго-ж, супроць прыватнай уласнасці.

Эканамічная, палітычная і нацыянальная прыгнечанне працоўных мас, работа з цёмнага да цёмнага на абшарніка і фабрыканта, адсутнасць сродкаў не толькі на вучэнне, але і на існаванне, саслоўная структура школ, абмежаванне праў працоўных у навуцы, якое ва ўсім жыцці краіны прымушала рабочых і працоўныя беднацка-серадняцкія масы вёскі заставацца непісьменнымі, жыць у цемры, безкультур'і.

Хто вучыўся да рэволюцыі ў Віцебскай мужской гімназіі.

Рабочых	0
Сялян	2,5 проц.
Дваран	61,2 проц.
Духоўніцтва	3,2 проц.
Гандляроў і чыноўнікаў	32,1 проц.

Рэволюцыйны рух прабудзіў масы.

Віцебскае земства не турбавалася з уядзеннем усенавуча. У 1913 г. у габінетах губернатара і гарадской думы размовы аб усенавучы скончыліся вывадам, што „Ажыццяўленне ўсеагульнага прымусовага навучання ў г. Віцебску магчыма толькі да канца першай паловы бягучага стагоддзя“. Што ж датычыцца вёскі, то «усеагульнае навучанне на вёсцы магчыма будзе ажыццявіць толькі да канца бягучага стагоддзя». Такім чынам для царскіх апрычнікаў, для ўвядзення ўсенавуча на базе толькі 3 класнай школы ў горадзе патрэбна было каля 40 год, а на вёсцы каля 90 год.

Толькі Вялікі Кастрычнік у 1917 г. на адной шостай зямной кулі канчаткова вырашыў пытанне нацыянальна культурнага будаўніцтва, адчыніўшы шлях нябачанага ў гісторыі чалавецтва росквіта навукі, культуры мільёнаў працоўнага насельніцтва былых царскіх акраін.

* * *

За XVI год дзякуючы ленінскай нацпалітыцы сталі непазнаваемымі.

..Мінула XVI год. Совецкі саюз, совецкая Беларусь, у тым ліку і наша Віцебшчына сталі не пазнаваемымі.

Беларусь, былая калонія царскай Расіі, з адсталай, заняпалай, некультурнай, непісьменнай ператварылася ў БЕЛАРУСЬ СОЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ, НА АБШАРАХ ЯКОЙ З КОЖНЫМ ДНЁМ УЗРАСТАЮЦЬ УСЁ НОВЫЯ І НОВЫЯ ГІГАНТЫ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ІНДУСТРЫІ, школы сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

У выніку пераможнага разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва і няўхільнага ажыццяўлення ленінскай нацыянальнай палітыкі, братэрскай дапамогі пролетарыяў шырачэзных працоўных мас соцыялістычных рэспублік Саюза, пролетарыі і шырокія працоўныя масы Віцебшчыны дабіліся буйнейшых поспехаў і перамог і на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Культурны фронт зараз у перыод пабудовы соцыялізма ў нашай краіне стаў складанай неад'емнай часткай гэтага будаўніцтва, бо «ад паглыблення і станоўчага вырашэння задач культурнай рэволюцыі» у значнай ступені залежаць поспехі соцбудаўніцтва.

Ажыццявілі ўсеагульнае пачатковае навучанне.

У Віцебску і раёне ўжо ажыццяўлена ўсеагульнае навучанне на базе пачатковай школы, а зараз усеагульнае навучанне ажыццяўляецца на базе дзесяцігодкі.

У 1913 г дырэктар народных вучылішч Тараноўскі даводзіў, што ў горадзе ахоплена школай толькі 33,4 проц. дзяцей школьнага ўзроста, па вёсцы ж процант ахопа школай складаў каля 25 проц. усіх дзяцей ва ўзросце 8—11 г.

У 1916—17 г. было ахоплена школай толькі 54,9 проц. дзяцей, у 1924—25 годзе — 78,7 проц, а з 1930—31 г. усе 100 проц дзяцей школьнага ўзроста навучаюцца ў совецкай палітэхнічнай школе.

Расце і абсалютны лік дзяцей у школах: у 1916—17 г. навучалася ва ўсіх школах горада 5812 ч., у 1924—25 г.—10241 чал., а ў гэтым навучальным годзе ўжо навучаецца—18631 чал.

Не адстае і вёска, дзе дзеці школьнага ўзроста ўсе ахоплены школьным навучаннем.

Такому грандыёзнаму росту спрыялі поспехі нашага соцыялістычнага гаспадарчага будаўніцтва, у выніку якога прадставілася магчымасць падвесці належную матэр'яльную базу пад народную асвету, якая з года ў год усё больш умацоўваецца і пашыраецца Асігнаванні на народную асвету (толькі на гарадскія школы) з 200795 руб. у 1925 — 26 годзе ўзраслі да 817600 руб. да пачатка першай пяцігодкі, а ў 1931—32 г. ужо складаюць 3883007 руб., альбо 35 проц. агульнага каштарыса.

Забяспечана навучанне на роднай мове.

На Віцебшчыне забяспечана абслугоўванне запатрабаванняў працоўных мас усіх нацыянальнасцяй на іх роднай мове. Да рэволюцыі зусім у Віцебску, у сучасным Віцебскім раёне не было беларускіх школ. Не было так сама польскіх і латыскіх. Зараз у горадзе і раёне дзеці навучаюцца на сваёй роднай мове. Сетка беларускіх школ па гораду з 15 у 1924—25 г. узрасла да 36, у гэтым годзе. Сетка яўрэйскіх гарадскіх школ узрасла да 12. Маюцца дзве польскія сямігодкі, адна латыская і адна цыганская школы.

Хто вучыцца ў Віцебскіх ВНУ.

Рабочых і дзяцей рабочых	53,6 проц.
Калгаснікаў	31,9 проц.
Працоўных аднаасобнікаў	4 проц.
Служачых	10 проц.

На вёсцы дзве польскіх школы і адна змешаная з выкладаннем на беларускай і польскай мовах, дзве латыскіх і 2 рускіх.

Аб дашкольным выхаванні да рэволюцыі і гутаркі не было. За выключэннем трох дзіцячых дамоў, у якіх налічвалася 41 дзіцё і аднаго яўрэйскага дзетсада з 15 дзяцьмі, больш нічога не было. Зараз у горадзе 63... дзетсада, якія ахопліваюць 4551 дзяцей рабочых і служачых, дзіцячых ясляй 31. На вёсцы—густая сетка пляцовак, у якіх выхоўваецца 2756 дзяцей, а таксама 90 ясляй.

Асігнаванні на дашкольнае выхаванне за першую пяцігодку павялічыліся ў чатыры разы.

На месцы камерцыйных вучылішч і гімназій выраслі ВНУ, тэхнікумы, рабфакі.

Велізарных поспехаў мы дабіліся ў галіне праф-тэхнічнай асветы. Да рэволюцыі яна з'яўлялася даступнай толькі класам эксплаататараў. Вучоба ў камерцыйным і рэальным вучылішчах, настаўніцкім інстытуце была платная. Вышэйшых навучальных устаноў у Віцебску зусім не было. Зараз у Віцебску маецца ветэрынарны інстытут, дзённы і вячэрні педагагічны інстытут, комуністычны вячэрні універсітэт і вячэрні рабочы ўніверсітэт. Лік студэнтаў у вышэйшых навучальных установах Віцебска дасягае 3500. Звыш 50 проц. студэнцтва—рабочыя ад варштатаў і больш 30 проц.—калгаснікі-работнікі соцыялістычных палёў.

Тэхнікумаў да рэволюцыі ў Віцебску не было. У 1921—22 г. іх было ўжо тры з 596 студэнтамі. Зараз у горадзе 14 тэхнікумаў і два на раёне, у якіх навучаецца больш 4 тысяч студэнтаў.

Два тэхнікума працуюць на яўрэйскай мове.

Рабфакаў зараз у горадзе 5 дзённых і 7 вячэрніх, у якіх займаецца звыш 2500 чал.

Віцебск зараз мае наступныя даследчыя ўстановы: ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ, ВЕТЭРЫНАРНЫ МУЗЕЙ, БАК ІНСТЫТУТ, АРХІЎ І ІНШ.

Цяжкая спадчына—непісьменнасць ліквідавана.

Аднэй з цяжкіх спадчын, якую мы атрымалі ад царызма—гэта была няпісьменнасць. 70 проц. непісьменнага насельніцтва налічвалася на Беларусі ў першыя гады пасля Кастрычніка.

Віцебшчына ў 1914 г. мела па аднаму толькі гораду 13811 непісьменных.

Пасля Кастрычніцкай рэволюцыі, нават, у самыя цяжкія гады грамадзянскай вайны мы надзвычай шпаркімі тэмпамі ішлі ўперад, ліквідуючы непісьменнасць, будуючы светлае соцыялістычнае жыццё. Так, у 1924 г. у нас ужо заставалася 5700 непісьменных, на навучанне якіх было выдаткавана толькі па мясцоваму каштарысу 3500 руб. па гораду. Па акрузе ў той час навучалася 6235 чал., якія ў сценах 327 школ змагаліся за ліквідацыю непісьменнасці.

1926 г з'явіўся годам рэзкага пералома. У гэтым годзе мы мелі 3722 чал. непісьменных.

У 1932 г. сярод карэннага насельніцтва непісьменных налічвалася ўжо толькі 460 чал. А 16 СНЕЖНЯ 1932 г. МЫ ВЫКАНАЛІ ЗАВЕТ ВЛАДЗІМІРА ІЛЬІЧА ЛЕНІНА І ДАМАГЛІСЯ ПЕРАТВАРЭННЯ ВІЦЕБШЧЫНЫ Ў РАЁН СУЦЭЛЬНАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ І ПРЫСТУПІЛІ ДА ЎВЯДЗЕННЯ ЎСЕАГУЛЬНАГА НАВУЧАННЯ ДЛЯ МАЛАПІСЬМЕННАГА ПРАЦОЎНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ЗА 4 ГАДОВУЮ ПАЛІТЭХНІЧНУЮ ШКОЛУ.

У 1932—33 навучальным годзе мы мелі па гораду рабочых школ 1 канцэнтра—83 з 158 групамі, у якіх навучалася—3439 чал. Па сельсоветам Віцебшчыны 145 школ на 228 груп, дзе навучалася—3459 чал. Надзвычай вялікае значэнне мае тое, што працоўныя ўсіх нацыянальнасцяй Віцебшчыны ліквідавалі няпісьменнасць на сваёй роднай мове, а зараз яны працягваюць усеагульнае навучанне ў нацыянальных школах для малапісьменных. Так, у 1932—33 навучальным годзе на Віцебшчыне існуе 13 яўрэйскіх школ, 8 польскіх, 1 латыская і 1 цыганская.

Няўхільна змагацца за ажыццяўленне культуры нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу—такава задача, бо:

— „Недастаткова ліквідаваць не пісьменнасць, але трэба яшчэ будаваць совецкую гаспадарку, а пры гэтым на адной пісьменнасці далёка не паедзеш. Нам трэба аграмаднае падвышэнне культуры. Трэба каб чалавек на справе карыстаўся ўменнем чытаць і пісаць“ — казаў Ленін у прамове 17 кастрычніка 1921 г.

У суадпаведнасці з рашэннем СНК БССР ад 10 жніўня 1933 г. на Віцебшчыне ўведзена ўсеагульнае навучанне рабочых і працоўных ва ўзросце да 50 год.

107 школ, 320 груп на 8 тысяч вучняў па гораду; 150 школ, 291 група для ахопу 6371 чал. на вёсцы—вось сетка ўсенавуча гэтага года.

Для працоўных нацыянальных меншасцяй адчынена 21 яўрэйская школа, 10 польскіх, 2 латыскія і 2 цыганскія.

Разгарнулася сетка клубаў, ленкуткоў, бібліятэк, чытален.

У Віцебску да Кастрычніка было толькі два клуба: дваранскі і афіцэрскі. Зараз маецца 21 рабочых клубаў. На прадпрыемствах разгарнулася шырокая сетка ленінскіх куткоў. 15 хат-чытален і 86 чырвоных куткоў насаджваюць культуру па сельсоветах, совгасах, калгасах і вёсках Віцебшчыны.

9 бібліятэк налічвалася да рэволюцыі. Зараз буйнейшых бібліятэк 21. Акрамя гэтага, пры ўсіх клубах, ленкутках, хатах-чытальнях маюцца невялікія бібліятэкі. Але не гледзячы на гэты рост, запатрабаванні да кніжок далёка яшчэ не задавальняюцца.

„Губернские ведомости“—газета, выходзіўшая два разы ў месяц з тыражом да 500 экз. і «Витебский вестник»—штодзённая газета з гэткім жа тыражом—вось што дапамагала буржуазна дваранскаму ладу трымаць у цемнаце масы. Не гаворачы ўжо аб зусім адваротных задачах, мэта імкнёнасці і класавай накіраванасці кожнага радка нашых большэвіцкіх газет, выходзячых зараз у Віцебску, трэба адзначыць, што тыраж «Віцебскага пролетарыя» даходзіць да 10 тысяч экз., акрамя гэтага мы маем палітаддзельскую чыгуначную газету, 10 фабрычна-заводскіх шматтыражак, тысячы насценных газет, выходзячых на прадпрыемствах установах совгасах, калгасах.

Віцебск мае свой другі Беларускі дзяржаўны тэатр, гарадскі тэатр, беларускі і яўрэйскі ТРАМ'ы, цырк. Вялікім поспехам у параўнанні з дарэволюцыйным часам з'яўляецца абсталяванне гукавога кіно, наліччa амаль што ва ўсіх рабочых клубах уласных кіно установак і шасці кінопераcовак па сельсоветах раёна.

Радыо - вузел абслугоўвае вялікую колькасць жыхараў. Ён мае, прыклад на 1600 радыо—кропак, 5 радыо—аўдыторый.

У пераможным росце соцыялізма рэшткі капіталістычных элементаў адчуваюць сваю гібель.

Культурна - нацыянальнае будаўніцтва—адзін з важнейшых участкаў соцыялістычнага будаўніцтва. Таму класавы вораг, фарбуючыся ў розныя колеры, спрабуе падарваць рост нацыянальна-культурнага будаўніцтва, аўладаць яго камандными вышынямі для правядзення сваёй падрыўнай работы.

Аб гэтым сведчаць і факты контррэволюцыйных нацдэмаўскіх вылазак, меўшых месца ў Віцебшчыне ў ветэрынарным інстытуце, кінотэхнікуме, польскай школе, варожыя справы махровых вялікадзяржаўнікаў, рэакцыянераў Веліхава, Сараева, якія двайнічаючы „ціхай сапай“ імкнуліся прывіць шкодніцкія погляды студэнтам і вучням.

Пролетарская грамадскасць пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі няўхільна ажыццяўляючы праграму партыі аб умацаванні пролетарскага інтэрнацыяналізма давала руйнуючы адпор ворагам дыктатуры пролетарыята.

Нашы поспехі і перамогі—грандыёзны. Партыйная арганізацыя Віцебшчыны дасягнула гэтых поспехаў у непрымірымай барацьбе за ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі. У барацьбе за пролетарскі інтэрнацыяналізм супроць вялікадзяржаўнага шавінізма—галоўнай небяспекі на данным этапе, контррэволюцыйнага нацдэмакратызма і шавінізмаў розных колераў і адценяў; вынік таго, што „братэрская дапамога з боку Совецкага саюза і гераічны энтузіязм працоўных пад кіраўніцтвам КП(б)Б у справе будаўніцтва соцыялізма ў Беларусі забяспечылі працоўным Беларусі велізарныя тэмпы роста гаспадаркі, якія перавышаюць агульна-саюзныя і стварылі ўмовы пад'ёма (торжаства) нацыянальнай культуры“. (З рэзолюцыі сакавіцкага пленума ЦК КП(б)Б).

КАГАН, ШЧУЦКІ, АБЛЯЦОЎ.

Няма старой Маркаўшчыны, есць новая Пролетарская Слабада

ЗА ДАЛЕЙШАЕ ПАЛЯПШЭННЕ МАТЭРЫЯЛЬНА-БЫТАВЫХ УМОЎ ПРАЦОЎНЫХ, ЗА ПАЛЯПШЭННЕ РАБОТЫ КААПЕРАЦЫІ І ЗАВАДСКІХ АДДЗЕЛАЎ РАБОЧАГА СНАБЖЭННЯ, ЗА ЎЗОРНАЕ ГРАМАДСКАЕ ХАРЧАВАННЕ.

(З Кастрычніцкіх лозунгаў ЦК УсеКП(б)).

Маркаўшчынскі пустыр. Так звалі тады ўладанні памешчыка Маркава, на якім бельгійскае акцыянернае таварыства—кучка капіталістаў пабудавала невялічкую фабрыку.

Гэта сапраўды быў пустыр: суцэльнае поле, якое межавала з лесам на берагу ракі Дзвіны. Недалёка ад пабудаванай фабрыкі, насупроць, сярод дрэў стаяў манастыр, а каля яго вялікія царквы...

— Ціха, сумна было ў Маркаўшчынскім пустыры—успамінае пра мінулае старая работніца фабрыкі „ДЗВІНА" Фёкла Якаўлеўна ЦЫГАНКОВА. Сюды прышоў і мой бацька. Ён уцёк з вёскі: не па сілах было яму і ўсёй нашай сям'і працаваць на памешчыка. і рашыў ён пашукаць шчасця ў горадзе.

Паступіў ён на фабрыку „Дзвіна" трапальшчыкам. Трапаў лён ад золака да цёмнага і за гэта атрымліваў 50 кап. у дзень. Кватэры не было. І ўрэшце знайшоў ён трушчобу для жылля, перавёў сям'ю сюды-ж у Маркаўшчыну.

З ПЛАЧАМ І СУМАМ ІШЛА Я НА РАБОТУ.

Працаваць аднаму—значыць быць асуджанаму на галодную смерць. На фабрыку паступілі працаваць мая маці, сястра і брат. Але на жыццё не хапала. Добра памятаю наша цяжкае становішча. Я разумела, што і мне прыдзецца пайсці на гэту фабрыку. Было мне ўсяго дзесяты год. І вось аднойчы бацька ўзяў мяне за руку і пайшоў разам са мною да брамы фабрыкі. Мы прыйшлі да інспектара. Бацька прасіў, каб мяне прынялі на работу. Інспектар паглядзеў на мяне, на мой твар і праз зубы працадзіў, што на работу ён мяне не прыме, нібы таму, што я яшчэ малая. Але бацька знайшоў спосаб: мае маці два разы дарма памыла бялізну фабрычнаму інспектару і мяне прынялі на работу. Паставілі мяне ў ватэрны цэх. У гэтым цэху работалі дзесяткі такіх-жа як я, малых дзяўчат. Праца была вельмі цяжкая, ізнураючая. Я павінна была бегаць цэлы дзень без перапынку ля ватэрных варштатаў, пільна сачыць, каб нітка не рвалася, а варштаты круціліся шпарка шпарка... Я не магла ні на мінуту адпачыць, бо супроць мяне звычайна стаяў „ганяла" (так звалі мы тады наглядальніка ўчастка) з бізуном у руках. Яго работа заключалася ў тым, каб падганяць рабочых, каб апошнія шпарка, без адпачынку працавалі.

... І так кожны дзень з рання да позняй ночы. І за гэта атрымлівала я 35 кап. у дзень. Прыду, бывала, позна вечарам дамоў і як забітая лягу на лаўку. Потым падымаюся, бяру кавалак хлеба, які мне пакідалі і жадна яго ем, бо за цэлы дзень каля ватэраў звычайна не ўдавалася нічога з'есці...

Я яскрава ўспамінаю адзін выпадак, які ўрэзаўся мне ў памяць і аб якім я доўга буду ўспамінаць. Гэта было каля паўдня. Я, як звычайна, працавала ля ватэраў і раптам мне стала млосна, закруцілася ў галаве і я пачала павольней працаваць. Тут падышоў да мяне ганяла ПІЛЬСКІ і бізуном ударыў мяне па спіне. Слёзы падступілі мне да горла, і я пачала горка, горка плакаць... На спіне бізун пакінуў свой крывавы след...

Так работала я пад страхам нагайкі... З плачам і сумам ішла я на работу...

І вось мінула мне 15 год, калі я стала ўжо самастойнай ватэршчыцай. Але становішча маё ад гэтага не палепшылася, хаця атрымлівала я пачала па 45 кап. у дзень. Нас мучылі штрафамі, за прагул адміністрацыя вылічвала з рабочых не толькі заработную плату, але і штрафавала. Крыкнула, ці запела работніца ў час працы —штраф. На мінутку адлучылася—зноў штраф, за ўсё штраф...

—А мы, адурачаныя рэлігіяй маліліся, прасілі бога, каб ён палепшыў наша становішча. Цёмныя былі мы, не разумелі, што рэлігія патрэбна толькі ў інтарэсах эксплаататараў, прыгняталь нікаў — так канчае сваё апавяданне старая ватэршчыца.

НЕ ПАЗНАЦЬ ЦЯПЕР МАРКАЎШЧЫНСКАГА ПУСТЫРА.

Новы дзень настаў на ільнапрадзільнай фабрыцы „Дзвіна". Ён настаў назаўтра пасля 7 лістапада, пасля гістарычнай даты, калі рабочыя сумесна з бяднейшым сялянствам, пад геніяльнейшым кіраўніцтвам партыі бальшавікоў, на чале з тт. ЛЕНІНЫМ і СТАЛІНЫМ, узброенай сілай заваявалі ўладу, аднялі ў эксплаататараў фабрыкі і заводы, у памешчыкаў зямлю, устанавілі пролетарскую дыктатуру, сваю рабоча-сялянскую ўладу.

Не пазнаць цяпер Маркаўшчынскага пустыра, няма яго сёння. Ёсць ПРОЛЕТАРСКАЯ СЛАБАДА, якая вырасла гіганцкімі тэмпамі за гады пяцігодкі. Зіхціць ва ўсе куткі. Фабрыка „Дзвіна" абрасла новымі пабудовамі, сталоўкай, яслямі, больніцай, клубам, дамамі, інтэрнатам і школай. Няма старой „Дзвіны" акружанай царквамі манастыра, атручваючых папоўска-рэлігійным вучэннем. Няма таго цёмнага граязнага жыцця ў рабочым пасёлку. Ёсць новае жыццё, культурнае, соцыялістычнае.

РАСКАЗ АБ НОВЫМ РАДАСНЫМ СВЕТЛЫМ ДНІ.

ФЁКЛА ЯКАЎЛЕЎНА ЦЫГАНКОВА канчала ліст; яна пісала гэты ліст брату Усціну, які пражывае ў Нова-Сібірску. Брат у ёй з далёкай Сібіры запытваў, як жывецца цяпер у Маркаўшчыне, якую ён пакінуў 18 год таму назад.

І Фёкла пісала вялікі ліст. Яна напісала брату аб усім. і аб тым, што не пазнаць цяпер бруднай старой Маркаўшчыны. Праз Маркаўшчыну ідзе трамвай, які звязвае яе з горадам, што яна, Цыганкова, наведвае кандыдацкую школу, рыхтуецца ўступіць у партыю.

Пісала яшчэ, што там супроць манастыра, дзе быў лес, зараз клуб, вялікая сталоўка, школа—дзесяцігодка.. Яна прасіла свайго брата прыехаць да яе ў госці, каб уласнымі вачыма ўбачыць, як рэвалюцыя перакраіла твар былой бруднай царкоўна-папоўска-капіталістычнай Маркаўшчыны.

ПЛЁНЫ НАШЫХ ВЯЛІКІХ РАБОТ.

... Вось едзем мы ў вагоне трамвая. Ён рухаецца маршрутам з Арлоўскай плошчы, канечная яго астаноўка ля варот фабрыкі «Дзвіна». Гэты трамвайны шлях цягнецца на 5 з паловай кілометраў і быў пракладзен у 1930 годзе.

Старая работніца НІКАЛАЕВА добра памятае, як у 1929 г. на прэзідыуме гарсовета стаяла пытанне аб пракладцы трамвайнай лініі на Маркаўшчыну. Яна тады думала:

— Пракласці трамвайную лінію па нашай маркаўшчынскай гразі—гэта фантазія

Але „фантазія" праз год стала сапраўднасцю. У 1930 годзе адзін за другім трамваі пабеглі па Маркаўшчыне.

Гэта была наша буйная перамога, рэальны вынік барацьбы нашай партыі ў справе паляпшэння ўмоў жыцця рабочых фабрыкі „Дзвіна".

НОВАЯ СТАЛОВАЯ ВЫПУСЦІЛА 1½ МІЛЬЁНА БЛЮД.

Другая буйная перамога на фабрыцы „Дзвіна"—гэта адкрыццё новай сталоўкі. У 1931 годзе рабочы калектыў сустрэў XIV гадавіну Кастрычніка адкрыццем новай сталовай—фабрыкі-кухні. Гэта сталовая разлічана на 6 тысяч чалавек, яе прапускная здольнасць—12 тысяч абедаў у змену. Цяпер яна прапускае 7 тысяч блюд. Сталовая работае ўзорна, там уведзена многаблюдная сістэма. Цяпер рабочыя фабрыкі абедаюць у чыстых і светлых памяшканнях, добраякасны абед. З пачатка года да 1 лістапада 1933 г. сталоўка выпусціла 1.500 тысяч блюд, гэта на поўмільёна больш, чым у 1932 годзе.

ПА-НОВАМУ ЖЫВУЦЬ РАБОЧЫЯ СЕМ'І.

Вырасла гіганцкімі тэмпамі зарабатная плата рабочых фабрыкі „Дзвіна" і падняўся яшчэ вышэй дабрабыт рабочых і работніц. Вось цікавае параўнанне роста зарплаты з даваенным узроўнем. У 1904 годзе сярэдняя гадавая зарплата рабочага на фабрыцы складала 161 руб. 03 кап., у 1908 годзе сярэдняя гадавая зарплата складала 185 руб. 71½ кап., у 1910 годзе—188 р 59 кап. Жыццёвы ўзровень тады быў вельмі нізкі навет фабрычны інспектар у лютым 1905 года звярнуўся з сакрэтным лістом да віцебскага губернатара. Ён тады пісаў: „Трэба пабудзіць адміністрацыю на ільнапрадзільнай фабрыцы «Дзвіна», павялічыць заработную плату рабочым, атрымліваючым 30—35 кап у дзень хаця бы на 5 кап., згодна жыццёваму мінімуму".

... А вось у 1932 годзе сярэдняя гадавая зарплата рабочага фабрыкі «Дзвіна» складае 871 руб., а ў 1933 годзе—1076 руб.

Фёкла Якаўлеўна Цыганкова — старая ватэршчыца заяўляе:

— Раней я ў дзень атрымлівала 40 кап. Мой гадавы заработак складаў тады прыблізна 160 руб., а цяпер я ў месяц зарабляю 160 руб. і гэта яшчэ залежыць ад таго, як я выконваю прамфінплан. Вось за другую палову кастрычніка я заработала 90 р. за два тыдні.

Жыццёвы ўзровень высока падняўся. Фёкле Якаўлеўне ніколі не снілася аб тым, што ў яе будзе чатыры паліто. Так, зараз у яе шафе вісіць чатыры паліто: адно зімовае, другое летняе, трэцяе выходнае, а чацвёртае для работы. Яна таксама мае абутак у дастатковай колькасці. Забяспечана і прадуктамі харчавання.

А калі ўвайсці ў яе дом—цёпла і чыста ўнутры. Яна купіла крэслы, канапу і інш. Кастрычнік усё змяніў і даў магчымасць такім, як Фёкла жыць у чалавечых умовах.

— Раней хоць і была ў нас крама фабрычная яшчэ да рэвалюцыі, але і бачыш бывала мануфактуру і інш.—аднак „хоць вока бачыць, ды зуб няймае". Хіба магла я за свае 45 кап. у дзень набыць што небудзь—гаворыць Фёкла і далей працягвае:—Нічога. А зараз увайдзеш у краму АРС, бярэш і прамтавары. Вось на Кастрычніцкія святы я атрымала крупы, масла, цукар і інш. прадукты і прамтавары.

Такіх як Фёкла на ільнопрадзільнай фабрыцы „Дзвіна" сотні. Цяпер дзеці рабочых і работніц фабрыкі «Дзвіна» выходзяць у людзі без тых мытарстваў, якія прышлося перанесці Фёкле і тысячам такіх, як яна.

Узяць сям'ю старой работніцы М. С. НІКАЛАЕВАЙ. Усе яе дзеці работаюць, дачка яе ФРУЗА работае ў друкарні, скончыла сямігодку, комсамолка, сын АЛЕКСАНДР—слесарам на фабрыцы „Дзвіна", дачка ГАННА ватэршчыца, старшая дачка ПЕЛАГЕЯ таксама ватэршчыца. Сама Нікалаева навучылася грамаце ў 1919 годзе і цяпер наведвае таксама акуратна школу.

На месцы, дзе раней былі трушчобы і старыя, наскрозь дзіравыя баракі—зараз выраслі новыя дамы для рабочых і работніц фабрыкі. Толькі за адзін 1932 год у жылбудаўніцтва ўкладзена 210.566 руб., а ў 1933 годзе на 1 кастрычніка ўкладзена 235.000 руб.

Аль бо ўзяць сям'ю старой работніцы РАМАНАВАЙ: сын ЦІМОХ работае ў Ленінградзе на фабрыцы «Знамя труда», член партыі, дачка МАР'Я—у гэтым годзе скончыла семігодку, збіраецца вучыцца далей, сынішка АЛЕКСАНДР вучыцца ў 5 класе маркаўшчынскай школы дзесяцігодкі, а муж работае на фабрыцы „Дзвіна". Сама Раманава з'яўляецца старшынёй цэхкома, член партыі з 1930 года.

Так па новаму жывуць рабочыя сем'і ў Пролетарскай слабадзе.

***

Вялікія ўкладанні мы маем і ў галіне соцыяльнага страхавання. Ды вось узяць такі прыклад. За 1913 год больнічная каса фабрыкі «Дзвіна» выдала па хваробе 328 руб. 83 кап., выдана 10 рожаніцам 156 руб., а ў 1932 годзе на справу соцстрахавання выдаткавана 875.798 руб. З іх аплата бюлетнеў—47.263 руб. па цяжарнасці—13.199 руб. на кармленне дзіцяці—3618 руб., пенсіі па інваліднасці—7323 руб. на дыетхарчаванне—4500 руб. А за перыод з 1 студзеня па 1 кастрычніка 1933 года выдаткавана на соцыяльнае страхаванне 172.356 руб. з іх аплата бюлетней—4776 руб., па цяжарнасці—13236 руб., кармленне дзіцяці—2856 руб., пенсіі па інваліднасці—15205 руб., дыетхарчаванне—4427 руб. У чацвертым квартале на ўтрыманне ясляў адпушчана 15200 руб., і дзіцячых садоў—20700 руб.

Гэтыя параўнаўчыя лічбы выдаткаў на соцстрахаванне пры царскім часе і пры ўладзе советаў з усёй яскравасцю гавораць аб вялікіх клопатах совецкай улады па паляпшэнні матэрыяльна-бытавых умоў рабочых і той кабале, у якой знаходзіўся рабочы, асабліва работніца пры царызме. Толькі за 1933 год на 1 лістапада на курортах былі 21 рабочых, а ў дамах адпачынка 155.

У бягучым годзе лепшая ўдарніца фабрыкі „Дзвіна" Ф. Я. Цыганкова атрымала пуцёўку ў плавучы дом адпачынка па р. Дняпро. Яна параходам праехала па Дняпру, пабывала ў Кіеве, на Днепрабудзе, у Днепрапятроўску. Яе ўражанні надзвычайна добрыя. Панарама Днепрабуда, металургічнага завода ў Днепрапятроўску натхнілі яе новым энтузіязмам і энергіяй для далейшай работы.

— Вось дзе я сапраўды ўбачыла куды ідуць народныя грошы, нашы пролетарскія пятакі,—успамінае Цыганкова аб гэтым надзвычай прыгожым і здаровым падарожжы па Дняпру.

ШТОДЗЁННЫЯ КЛОПАТЫ АБ РАБОТНІЦЫ-МАЦІ.

На ільнапрадзільнай фабрыцы «Дзвіна» пераважная большасць рабочых—жанчыны. Кастрычніцкая рэвалюцыя вызваліла і раскняволіла жанчыну. Яна поплеч з мужчынай будуе соцыялізм.

На фабрыцы «Дзвіна» пашыраюцца такія ўстановы, як дзетсады. Цяпер не тое, што раней. Няма такіх выпадкаў, каб цяжарным не давалі адпачынка. Паводле нашага Совецкага законадаўства работніца атрымлівае адпачынак да радоў і пасля радоў. А раней да рэвалюцыі, жывы яшчэ ўспаміны аб тым, як работніцы СЦЯПАНАВА і КАЗІМІРАВА заставаліся работаць на фабрыцы нават тады, калі ў іх былі перадрадовыя сударагі.

Зараз фабрыка мае яслі на 120 чал., будуюцца новыя яслі, ёсць два дзіцячых сада, начны стацыянар на 50 чалавек., работае пры фабрыцы медпункт, пабудавана і работае новая больніца.

БЫЛАЯ АДСТАЛАЯ ЦЁМНАЯ МАРКАЎШЧЫНА СТАЛА ПІСЬМЕННАЙ.

Былая Маркаўшчына адрознівалася не толькі сваім брудам, але і непісьменнасцю. Да рэвалюцыі ў Маркаўшчыне не было аніводнай школы. Дзеці рабочых і работніц не вучыліся, а з дзяцінства пападалі на фабрыку, прымушалі іх хадзіць у царкву маліцца богу.

Цяпер, калі пры фабрыцы «Дзвіна» работае школа-дзесяцігодка, пабудаваная ў мінулым годзе, у якой навучаецца 872 дзяцей работніц, работае вячэрні рабочы універсітэт, рабочы калектыў фабрыкі вучыцца пісьменнасці, авалодвае навукай і дзеці рабочых паспяхова ў чыстых і цёплых класах школы выхоўваюцца ў актыўных будаўнікоў бескласавага соцыялістычнага грамадства.

ЦЯПЕР З ПЕСНЯЙ ІДУ Я НА РАБОТУ.

Зараз гаворыць Фёкла Цыганкова.

— Рада я за сваё жыццё. Цяпер з песнямі, з радасцю іду я на работу да свайго варштата і бяруся за выкананне прамфінплана, бо ведаю, што фабрыка гэта—наша, што мы з'яўляемся гаспадарамі гэтай фабрыкі, усяго нашага пасёлка—Пролетарскай слабады.

Тысячу разоў права Цыганкова. Усе гэтыя поспехі ў галіне соцыяльна-бытавых умоў рабочых фабрыкі «Дзвіна» з'яўляюцца толькі часцінай нашых агульных поспехаў і атрыманы толькі таму, што гаспадаром краіны з'яўляецца рабочы клас, які пад кіраўніцтвам свайго авангарда—Комуністычнай партыі і яе правадыра т. СТАЛІНА будуе бескласавае соцыялістычнае грамадства.

Усе гэтыя поспехі здабыты таму, што гаспадарамі фабрык і заводаў з'яўляюцца такія як Фёкла Якаўлеўна Цыганкова.

А старая ватэршчыца Фёкла Цыганкова—член ЦВК БССР, член бюджэтнай камісіі ЦВК БССР.

Яна—гаспадар краіны, гаспадар краіны—рабочы клас!

Б. Зеліксон.

Напярэдадні XVI гадавіны Кастрычніка за мяжой.

ЧЭХА-СЛАВАКІЯ.

З Прагі выехала ў Маскву на кастрычніцкія ўрачыстасці чэхаславацкая рабочая дэлегацыя ў складзе 13 чалавек, у тым ліку два комуніста, 7 соцыялістаў і 4 беспартыйных. Два дэлегата прадстаўляюць беспрацоўных, адзін—бяднейшае сялянства. Дэлегацыя перадасць рабочым СССР прывітальны адрас, пакрыты дзесяткамі тысяч подпісаў працоўных Чэха-Славакіі.

З лістапада ў Празе адбыўся даклад прафесара Нееддага „16 год совецкай культуры". Двухтысячная аўдыторыя натхнёна вітала аграмадныя дасягненні СССР на фронце соцбудаўніцтва. Прысутнічаўшы на дакладзе паліцэйскі камісар забараніў галасаванне рэзалюцыі.

ФРАНЦЫЯ.

Цэнтральны камітэт компартыі Францыі парашыў правесці 8 лістапада ў Парыжы і па ўсёй краіне сотні сходаў і мітынгаў, прысвечаных 16-й гадавіне Кастрычніка.

РУМЫНІЯ.

У Румыніі ў сувязі з набліжэннем 16-й гадавіны Кастрычніка арыштавана многа рабочых, падазраваемых у прыналежнасці да компартыі. Па паведамленні ахранкі, як быццам удалося, выкрыць кіраўніцтва румынскай компартыі і рэвалюцыйнай прафсаюзы і таксама падпольныя друкарні. Урад пагражае адназіць адменены толькі ў верасні стан аблогі.

Лейпцыгская інсцэніроўка ў Берліне.

Паказанні сведкі Вейс.

ЦУРЫХ, 3. На адкрыўшымся 30 кастрычніка пасяджэнні Дзімітраў прысутнічае ў зале суда. Але на тым-жа пасяджэнні ён зноў выключаецца, на гэты раз на тры пасяджэнні, за „дзёрзкі" адказ пракурору Вернеру.

Адбылася гэта ў часе допыта прыбыўшай з Масквы сведкі ВЕЙС. Вейс пражывае ў Маскве ў якасці палітэмігранткі. Яна добра ведае Папова і заяўляе, што ён пражываў у яе з мая па ліпень 1932 г. На працягу трох месяцаў яна штодзённа сустракалася з Паповым і яго жонкай. У канцы 1932 г. Папоў уехаў у санаторый на поўдзень СССР. Тым самым сведка абвергла паказанні ілжэсведак, якія сцвярджаюць, што бачылі Папова летам 1932 года ў Берліне.

У пачатку допыта Вейс, адбываюцца спрэчкі па повадзу імя сведкі. Знаходзячыся ў СССР замужам, Вейс не змяніла сваё дзявочае прозвішча. У звязку з гэтым пракурор Вернер сумняваецца ў правільнасці заявы т. Дзімітрава, што жонка можа ў СССР захаваць сваё прозвішча.

ДЗІМІТРАЎ: „Вам яшчэ многаму прыдзецца павучыцца".

Старшыня хацеў было пакінуць гэту заўвагу без вынікаў, але пракурор Вернер настаяў на тым, каб суд удаліў Дзімітрава на тры пасяджэнні.

Потым дапытваецца маці сведкі Вейс. Яна поўнасцю пацвярджае паказанні сваёй дачкі. Яна падрабязна апісвае, як Папоў жыў у яе доме ў Маскве ў той час, калі ён, па заяве ілжэсведак, знаходзіўся ў Берліне.

Напярэдадні выступлення Герынга.

ПРАГА, 4. Паводле паведамлення з Берліна, 4 лістапада ўвесь раён рэйхстага ацэплен буйнейшымі нарадамі паліцыі. Пропускі на працэс ануляваны і выданы спецыяльныя білеты. Усіх уваходзячых у памяшканне рэйхстага і выходзячых адтуль абшукваюць. Гэтыя меры тлумачацца тым, што у якасці «сведкі» павінен выступіць прускі прэм'ер Герынг.

Выключаны 3 лістапада на 3 пасяджэнні Дзімітраў 4 лістапада «у выглядзе выключэння» зноў дапушчан на пасяджэнне. Такая «міласць» матывуецца тым, што «паказанні Герынга маюць аграмаднае значэнне для абвінавачваемых».

Дэлегацыя ўрада СССР у Турцыі.

ІЗМІР, 4. Паводле паведамлення анаталійскага агенцтва, совецкай дэлегацыі ў Ізміры быў аказан выключна радушны прыём. Сустрэўшыя дэлегацыю губернатар і камендант горада правадзілі гасцей у дом Кемаль-пашы. Дачка губернатара паднесла жонцы тав. Варашылава кветкі. Студэнты сельска-гаспадарчага інстытута сустрэлі дэлегацыю авацыяй.

З прычыны выражанага Варашылавым жадання наведаць адну з сельскіх школ, дэлегацыі было прапанавана наведаць вёску Пінасбакі. Там група сялян сустрэла і вітала гасцей. Затым дэлегацыя звязалася з сялянамі. Агледзеўшы школу, Варашылаў і ўся дэлегацыя выказалі сваё захапленне. Насельніцтва паўсюды горача вітала гасцей.

ІЗМІР, 4. Па паведамленні анаталійскага агенцтва, 4 верасня Варашылаў наведаў люстэркавую фабрыку. Рабочыя натхнёна віталі совецкую дэлегацыю, якая была глыбока кранута цёплай сустрэчай. Ноччу дэлегацыя прыбыла ў БАЛІКЕССІР, дзе ёй былі аказаны воінскія пашаны. Варашылаў сказаў з балкона прамову, у якой вітаў незалежную і развіваючуюся Турцыю, Кемаль-пашу, непарушнае совецка-турэцкае сяброўства, а таксама турэцкую армію, асабаніўшую край ад імперыялістаў. Музафер-паша у адказ крыкнуў: «Няхай жыве Чырвоная армія»!

КАПІТАЛІЗМ УСТУПІЎ У ПЯТУЮ ГАЛОДНУЮ ЗІМУ.

Германія.

Самая цяжкая зіма за 100 год.

Міністр прапаганды ГЕБЕЛЬС заявіў у Кенігсбергу на сходзе аўтамабільных фабрыкантаў: «Мы ідзем насустрач зіме, якая будзе самай цяжкай за апошнія 100 год» („РУНДШАЎ").

400.000 бяздомных.

Паводле статыстычных даных, у Германіі маецца 400 000 бяздомных, вандруючых з горада ў горад. Пасля таго, як 1 кастрычніка 1933 г. была адменена законадаўчая абарона кватэранаймальнікаў, колькасць бяздомных напэўна яшчэ больш вырасла". („Тэгліхе рундшаў", 1933 г.)

«Шырокая дарога, злучаючая Гамбург з Берлінам, запоўнена бясконцым ланцугом бяздомных людзей. Яны вандруюць па гэтай дарозе ў абодвух напрамках і іх так многа, што яны маглі-б з вуснаў у вусны перадаць любую навіну з Гамбурга ў Берлін і назад»... («Ды тат», 1933 г.).

Англія.

„У трушчобах Англіі".

Страшэнныя ўмовы жыцця ў трушчобах у буйным цэнтры цяжкай індустрыі—Бірмінгаме.

У раёне рабочых раёнаў вуліцы настолькі брудныя, што знаходзяцца на ўзроўні сярэднявечных гадоў мінулага стагоддзя. У дамах няма вады, прыбіральняў, святла. Гэта—сыродныя памяшканні, поўныя клапоў, перанаселеныя немагчымасці.

У Глазга па даных камісара шатландскага аддзела ахоўы здароўя, у большасці абследваных дамоў так цёмна, што жыхары круглы год на працягу ўсяго дня вымушаны карыстацца штучным святлам.

Вільгаць пранізвае ўсе дамы, са столі, якая амаль што абвальваецца, цячэ вада, падлога гніе, у сценах такія шчыліны, што праз іх можна бачыць прахожых на вуліцы.

Такія-ж трушчобы існуюць у старым, вырасшым на рабаганстве Ліверпулі. Сэрца Ліверпуля напамінае гіганцкую памыйную яму.

У дамах, якія яшчэ год 80 таму назад былі прызначаны да зруйнавання, з прычыны іх поўнай непрыгоднасці, у сучасны момант усё яшчэ жывуць тысячы чалавек. У гэтых трушчобах смяротнасць у 1½ разы перавышае сярэднюю па гораду". („Дэйлі геральд").

Аўстрыя.

Адна з тысяч трагедый.

«...Краўчыха расказвала аб тым, што яе муж ужо даўно беспрацоўны і ходзіць у Ніжняй Аўстрыі з дома ў дом у пошуках якіх-небудзь занятку. Яна не атрымлівае ніякай дапамогі. Чым жа жыць? Чым даць дзецям памерці з голада, лепш ужо.. У бліжэйшыя дні ёй нават пагражае высяленне. Домаўласнік прапанаваў ужо ўчора ачысціць кватэру.

Што-ж дзівунага, калі яна хацела памерці са сваімі дзецьмі?» („Арбейтэр цэйтунг", 12 ліпеня 1933 г.).

Японія.

„Бядоты беспрацоўных бязмежны".

У Японіі налічваецца больш 2 млн. беспрацоўных, што разам з сем'ямі складае звыш 7 млн. чал. Беспрацоўе расце паўпрэкі надзвычайнай ваеннай канюнктуры. Беспрацоўныя бадзяюцца натоўпамі па вуліцах японскіх гарадоў, галодныя і абарваныя. Ніякіх магчымасцей падтрымаць сваё існаванне ў гэтых мільёнаў нашчасных людзей няма.

Галодная смерць на вуліцы рабочага квартала—самае звычайнае з'явішча. Сотні беспрацоўных цэлымі днямі таўпяцца ля варот фабрык, заводаў і верфей. Яны спадзяюцца на тое, што прамысловасць, так шалёна працуючая «на абарону бацькаўшчыны», запатрабуе іх рабочую сілу.

Калі бядоты беспрацоўных бязмежны ў сваёй кашмарнай сапраўднасці, то становішча работаючых не намнога лепш. Яны работаюць з выключнай напружанасцю, пры надзвычайна нізкай зарплаце, нехапаючай нават для скупога харчавання самі і працуючага. І ў той жа час у інтарэсах правячага класа і военшчыны, іх браты і сыны пасылаюцца ў Манчжурыю, Кітай ці ў Карэю і на Фармозу ў якасці пушачнага мяса...

Можна з упэўненасцю сказаць, што ўплыў комуністычнай партыі Японіі неўхільна ўзрастае. Рабочыя і сяляне мабілізуюцца для забастовак, для дэманстрацый супроць зніжэння зарплаты і беспрацоўя. Яны мабілізуюцца супроць вайны ў Кітаі, супроць другой сусветнай вайны і для абароны кітайскіх советаў і СССР».

(„Чайна ўіклі рэв'ю"—амерыканскі журнал у Шанхаі).

Кітай.

Вотрубі і лахманы.

«У Цяньцзіне налічваецца 6 буйнейшых тэкстыльных фабрык, на кожнай з якіх занята да 4.000—5000 рабочых, галоўным чынам жанчын і дзяцей. Рабочы дзень хістаецца ад 12 да 14 гадзін, прычым пасля змены на варштатах рабочыя гадзіну—другую заняты на падсобных работах. Фабрыкі работаюць у 2 змены. Зарплата рабочых, акрамя старшынак, якія атрымоўваюць 1 долар у дзень, хістаецца ад 20 да 40 цэнтаў у дзень, чаго недастаткова для таго, каб купіць рыса для аднаго чалавека, не кажучы ўжо аб сям'і ў 8 чалавек.

(Кітайская бурж. газ. «Ішы-бао»).

План правядзення святкавання 16 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

6-га лістапада, а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканні Белдзяржтэатра склікаецца ўрачысты пленум гарсовета сумесна з прадстаўнікамі партыйных, прафсаюзных, комсамольскіх, ваенных і грамадскіх арганізацый.

Білеты размяркоўваюцца ГСПС праз ФЗМК прадпрыемстваў.

У перыод ад 6 да 9 лістапада ў клубах, тэатрах, чырвоных кутках праводзяцца Кастрычніцкія вечары калектываў, паводле плана, зацверджанага гаркамісіяй па святкаванні XVI гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

7 лістапада на плацу Леніна—парад войск частак віцебскага гарнізона. Пачатак парада роўна ў 10 гадзін раніцы. Камандуючы парадам—т. МАРОЗАЎ.

7 лістапада—агульна-гарадская Кастрычніцкая дэманстрацыя рабочых арганізацый. Пачатак роўна ў 11 гадзін раніцы.

План і парадак дэманстрацый.

Рабочыя, служачыя, студэнты і вучні збіраюцца згодна плана гаркамісіі ка прадпрыемствах, альбо у клубах, выстрайваюцца ў калоны па 6 чал. у рад, выдзяляюць старшага шасцёркі з правага фланга з абазначэннем на рукаве чырвонай павязкі і па указанню начальніка калоны накіроўваюцца да зборных пунктаў, дзе аб'ядноўваюцца ў зводныя калоны і пад камандай кіраўніка калоны прыбываюць на плац Волі.

Усе калоны дэманстрантаў рухаюцца на плац Леніна, пачынаючы ад плаца Волі 2-ма паралельнымі маршрутамі па 12 чал. у рад у 2 калоны.

Парадак руху калон прадпрыемстваў наступны: ад месца збора калон на плац Волі займаюць месцы па ўказанні каменданта дэманстрацыі, зліваюцца з паралельным маршрутам і накіроўваюцца на плац Леніна. Пасля прахода каля трыбуны першы маршрут накіроўваецца ўправа па Вальнічнай вул. і следуе да месца роспуска калоны па вольнаму маршруту, не заварачваючы на плац Леніна і Ленінскую вул.

Калона 2 маршрута, пасля прахаджэння каля трыбуны, накіроўваецца ўлева па вуліцах: 1 Ветраная і Валадарская і разыходзіцца да месца роспуска калон.

Калоны дэманстрантаў, выстраеныя па Ленінскай вул., маюць галаву калоны на рагу Ленінскай і Совецкай вуліц і да сканчэння парада чырвонаармейскіх часцей займаюць правы тратуар і частку вуліцы, сустракаюць вяртаючыяся з парада вайсковыя часткі гарнізона і пасля іх прахаджэння, роўна ў 11 гадзін раніцы, па ўказанню кіраўніка дэманстрацыі, пачынаюць следаванне на плац Леніна.

Кіраўнік дэманстрацыі—КАСЯКІН.
Камендант СКАРАХОДКІН.

Парадак пастраення калон.

У 9 г. 30 м. на плацы Волі каля Палаца працы збіраюцца: чырвоныя партызаны, чырвонагвардзейцы. Накіроўваюцца на плац Леніна, куды прыбываюць роўна ў 10 гадзін раніцы.

Кіраўнік калоны—т. ШУБІН.

У 10 г. 15 м. раніцы да Палаца працы прыбывае зводны піянерскі полк, займае па ўказанню каменданта дэманстрацыі месца ў галаве ўсіх калон і рухаецца па Ленінскай вуліцы да рагу Ленінскай і Совецкай вул.

Кіраўнік калоны—т. РАГОЖКІН.

Першы зборны пункт—1 калона.

Каля ст. Віцебск МББ збіраюцца рабочыя віцебскага чыгуначнага вузла МББ чыг. к 10 г. раніцы і прыбываюць на плац Волі ў 10 гадзін 30 мін.

Кіраўнік калоны—т. КАЗІННІК.

Другі зборны пункт—2 калона.

Каля клуба «Чырвоны металіст» к 10 гадз. збіраюцца рабочыя саюза металістаў (Акулярная, „Чырвоны металіст", Завод «Комінтэрн», ФЗВ металістаў, Голкавая фабрыка).

Кіраўнік калоны—т. ГАЛУЗА.

Трэці зборны пункт—3 калона.

Каля клуба панчошніц збіраюцца рабочыя саюза тэкстыльнай прамысловасці ў 10 гадзін раніцы. (Фабрыка „Дзвіна", імя Клары Цэткін, Фабрыка „КІМ", уцількамбінат, ФЗВ панчошніц, Тэкстыльаб'яданне).

Кіраўнік калоны—т. КВІНТА.

Чацверты зборны пункт—4 калона.

Каля клуба швейнікаў збіраюцца рабочыя саюза швейнікаў у 10 гадз. раніцы. (Фабрыка «Прафінтэрн» „Сцяг індустрыялізацыі", ФЗВ швейнікаў, Швейснабзбыт).

Кіраўнік калоны—т. СЕРЭБРАНСКІ.

Пяты зборны пункт—5 калона.

АРЛОЎСКІ ПЛАЦ. збіраюцца рабочыя саюза Дрэваапрацоўнікаў, а 10 гадз. раніцы (Фанерны завод. Інструментальна-мэблёвая, лесазавод № 13, Лесакамбінат ВВО, Мэблёвая фабрыка, Лесазавод № 3.

Кіраўнік калоны—т. МАЛЬЧЫК.

Шосты зборны пункт—6 калона.

У 10 гадз. 30 мін. каля скурзавода збіраюцца рабочыя скуранной прамысловасці (скурзавод, шчоткамбінат, фабрыка імя Лекерта, фабрыка „Прагрэс", ФЗВ абутнікаў).

Кіраўнік калоны—т. РАПАПОРТ.

Сёмы зборны пункт—7 калона.

Каля клуба будаўнікоў — збіраюцца рабочыя саюза будаўнікоў а 10 гадзіне 50 мін. Усе групкомы будаўнікоў аб'ядноўваюцца ў адну калону і прыбываюць на плац Волі а 11 гадзін 10 мін.

Кіраўнік калоны—т. АВЕРБУХ.

Восьмы зборны пункт—8 калона.

Каля піўзавода збіраюцца рабочыя саюза харчавікоў і грамадскага харчавання к 11 гадзінам раніцы.

Кіраўнік калоны—т. ГУРЭВІЧ.

Дзевяты зборны пункт—9 калона.

К 11 гадзінам каля клуба Саюзтранса збіраюцца рабочыя саюза транспартнікаў. Кіраўнік калоны—т. ВАСКІН.

Дзесяты зборны пункт—10 калона.

У 11 г. 30 мін. каля клуба кіраўніцтва трамвая збіраюцца рабочыя саюза комунальнікаў.

Кіраўнік калоны—т. БЕСЯКОЎ.

Адзінаццаты зборны пункт—11 калона.

Каля 4 комунальнага дома (Совецкая вуліца) збіраюцца рабочыя саюза керамічнай прамысловасці і рабзелеса, у 10 гадз 40 мін.

Кіраўнік калоны—т. ЛЕЎШЫН.

Дванаццаты зборны пункт—12 калона.

Каля клуба „Прафінтэрн" збіраюцца члены саюза дзяржгандаля і кааперацыі, дзяржустаноў і фінработнікі.

Кіраўнік калоны—т. БЕЙЛІН.

Трынаццаты зборны пункт—13 калона.

У 11 гадз. 50 мін. каля клуба саюза працасветы збіраюцца працаўнікі саюза працасьветы і ТПД, рабочыя, друкарні „Комінтэрн".

Кіраўнік калоны—т. БОЛДЫШАЎ.

Чатырнаццаты зборны пункт—14 калона.

Набярэжная вул. (каля Еўпедтэхнікума) к 12 гадзінам збіраецца студэнцтва ўсіх сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў.

Кіраўнік калоны—т. РАФАЛОВІЧ.

Пятнаццаты зборны пункт—15 калона.

У 12 гадз. каля памяшкання цэнтраархіва збіраюцца члены саюза медсанпрацы.

Кіраўнік калоны—т. ЛЕЕНСОН.

Шаснаццаты зборны пункт—16 калона.

Рынычная, каля памяшкання сампрамсаюза. Збіраюцца ўсе арцелі сампрамсаюза і імя 25 кастрычніка і члены камітэта ўзаемадапамогі.

Кіраўнік калоны—т. ЛЕЙВОВІЧ.

Маршруты выступлення калон.

У 10 гадзін 40 мінут з плошчы Волі па вул. Леніна на плошчу ім. Леніна, пачынаецца рух калон дэманстрантаў па 1 і 2-му маршруту паралельна.

1 МАРШРУТ—калоны металістаў, тэкстыльшчыкаў, будаўнікоў, воднікаў, транспартнікаў, МТС, работнікі асветы, навучальныя ўстановы, кааперацыя, дзяржгандаль і дзяржустановы, сампрамсаюз.

2 МАРШРУТ—чыгуначнікі, швейнікі, дрэваапрацоўнікі, комунальнікі, скурнікі, харчавікі, і медсанпрацоўнікі.

ГАРАДСКАЯ КАМІСІЯ ПА ПРАВЯДЗЕННІ XVI ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ.

6, 7, 8 лістапада
ДЗЯРЖЦЫРК
ГРАНДЫЁЗНЫЯ ЦЫРКАВЫЯ ПРАДСТАЎЛЕННІ
12 НУМАРОЎ ЛЕПШЫХ АРТЫСТАЎ І АТРАКЦЫЁНАЎ
У 3-х ВЯЛІКІХ АДДЗЯЛЕННЯХ
АПОШНІЯ 3 ДНІ ГАСТРОЛЯЙ БЕРБЕРЫЙСКІЯ ЛЬВЫ—ВОЛАТЫ
8 лістапада Дзіцячы ранішнік Пачатак у 2 г. дня.
9 лістапада АДКРЫЦЦЕ МАТЧАЎ французскай прафесіянальнай БАРАЦЬБЫ
Кіраўнік—вядомы спортсмен арбітр І. ЛЕБЕДЗІНСКІ
ПОЎНАЯ ПЕРАМЕНА ЦЫРКАВОЙ ПРАГРАМЫ.
Пачатак а 8½ г. вечара. Каса адчынена з 12 да 3 і 5 да 9 г.
Гарадская каса (вуг. Вагзальнай і Канатнай) з 11 г. раніцы.

КІНО «1 МАЯ»
З 6-га лістапада лепшы гукавы гаварашчы фільм! Пачатак у 6 г. вечара.
„СУСТРЭЧНЫ".

Нам. адк. рэдактара У. ВЕРЖБАЛОВІЧ.

Главліт № 12.

Друкарня „Комінтэрн", Большэвіцкая 10